Войскі ВКЛ ☞ 3

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Шлях на Грунвальд ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 29 (2827) Год LV | Беласток, 18 ліпеня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)


**Чарговы захад сонца прыпыняе на пару гадзін крывецкі гоман. Час ад часу па амаль ужо чорным асфальце сунецца машына ў летнім настроі з гучнай музыкай і кліентамі цэнтральнага пункта вёскі.**

**— У нас свая мова, свая культура і свая крама, — уголас смяецца адна з заўсёдніц вечаровых пасядзелак на лавачцы. На ёй зараз дзядзька Грыша, яго жонка Зінка, суседка Вера і спадарыня Крыся — солтыс Крыўца.**

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

# Запішамся беларусамі

Паню Крысю пазнаю „ад кухні". У час дзіцячага летніка ахвотна прыязджала вечарам з бітонам малака. Каровіна малако — смак, які ў горадзе маркетаў даўно забылі. Часам парэчку прывозіла, а нават смятану на масла.

— У маслабойцы рабіць будзем? — пытаю.

— Нееее, гадзінамі дзеці сядзелі б над маслабойкай. У бутэльках!

Паўтаралітровая бутэлька тыпу пэт, у ёй смятана, а пасля масла. Сучасны вясковы спосаб. Атмасфера ў вёсцы таксама вельмі свабодная.

— Мы ўжо не вышываем, як тыя вашыя дзеці на летніку, — смяюцца мясцовыя нестаркі. — Усё можна набыць зараз у краме. Але ж людзі калісь дурныя былі! Чаго было столькі кіламетраў ехаць ажно з Лянева да нас па ягады!

Цішыня. А пасля зноў смех і хіхіканне. То жарт, то падманка.

— Так у нас ёсць, раз весела, іншым разам як усюды, — даказвае іншая лавачка.

***

7 ліпена праваслаўныя адзначаюць дзень святога Іаана Хрысціцеля. Дзень святочны, таму ў Крыўцы таксама не працуюць. Гэта якраз серада, а гэты дзень тыдня, не толькі гледзячы на свята, вельмі рухавы. Гэта прыёмны дзень у праваслаўным асяродку „Свет" для ўсіх, якія патрабуюць парады айца Гаўрыіла. Штодзень жыве ён у скіце ў Адрынках. Кожную сераду прымае гасцей і поўных надзеі людзей, якім лячэнне зёлкамі бывае апошнім паратункам. Панадворак перад асяродкам ажыўляецца каля гадзіны 17.30. Праз паўгадзіны традыцыйны акафіст, а пасля прапанаваны айцом Гаўрыілам фільм у крузе праваслаўнай тэматыкі. На гэты раз малілася супольна каля 70 чалавек.

— Бывае больш, так, так, — гаворыць спадарыня Марыя, якой сям'я вельмі ангажуецца ў дапамогу айцу і арганізацыю праваслаўных сустрэч у Крыўцы. — Многа людзей з самой вёскі прыходзіць. Праўда, ёсць такія, якія ніколі не паяўляюцца, але кожны сам рашае.

— Сёстры, дам вам агурцоў і памідораў, — перапыняе размову архімандрыт.

Многія ў падзяцы абдароўваюць манаха тым, што ў іх самае лепшае. Ён звычайна дзеліцца і частуе, але тым самым трымае грамаду. Людзі прыязджаюць не толькі дзеля лячэння зёлкамі, але таксама, як сказалі мне маладыя людзі з Гайнаўкі, для самой асобы айца Гаўрыіла.

— Не ўсе яго кахаюць, — амаль шэпча адна з жанчын. — Пакідаюць тут розныя прадметы, вяжуць стужкі. Такія людзі.

Айцец Гаўрыіл гэтым не пераймаецца, толькі дапамагае як умее. Тэлефон за тэлефонам, калі селі з ім на хвіліну размовы. Хтосьці пра бліжэйшыя планы, іншы з болем галавы. Нейкая парада знойдзецца.

— А якую параду маеце для беларусаў? Перад намі перапіс насельніцтва ў бліжэйшым годзе, — заяўляю.

— Я ўжо не раз казаў, што не можам саромецца сваёй тоеснасці. Іншая справа, што тут большасць складаюць беларусы.

— А запішуцца беларусамі?

— Думаю, што так. Ведаеце, тут нас прабуюць нават украінізаваць. Прывезлі адзін такі ўкраінскі часопіс. Я сумленна вылажыў яго, але, уявіце сабе, нікога ён не цікавіў. От, адна жанчына ўзяла паглядзець карцінкі. Гэта сведчыць пра атмасферу тут. Зрэшты, пакойны архіепіскап Міран, пабываючы ў Ласінцы, сказаў аднойчы: „Няма што ўкраінізаваць беларусаў". Я згодны.

***

— Ведаеце, тут амаль усе праваслаўныя. Большасць можа і лічыць сябе беларусамі, але неабавязкова прызнаюцца да гэтага ў час перапісу, — чую пры адной хаце.

Лавачку далей размова ідзе ў іншы бок.

— У нас сям'я ў Гданьску. Там ніхто не гаворыць, што іншы гэта горшы ці кепскі. Там не цікавяць такія прыватныя справы, бо кожны мае права быць іншым.

Спадарыня Вера не так ужо доўга жыве ў Крыўцы, але раней шмат гадоў прыязджала сюды адпачываць. Ведае людзей, вёску, добра сябе адчувае на пенсіі.

— Тут свае людзі, а што беларусы гэта нармальная справа. Я жыла столькі гадоў у Беластоку і ў папярэднім перапісе таксама запісалася беларускай. Таксама зраблю жывучы ў Крыўцы.

— Няма чаго саромецца, — пацвярджае суседка Зіна. — Наша дачка жыве ў Нямеччыне і можа зараз лепш гаворыць панямецку чым па-беларуску, але з намі па тэлефоне заўсёды гаворыць па-свойму.

— Ці маладыя людзі, якія гавораць і адчуваюць сябе беларусамі, засталіся ў Крыўцы?

— О, сядзіць маладая, — паказваюць на солтыса вёскі, паню Крысю.

— Але дзе я там маладая! Ёсць сапраўды маладыя сем'і. Праўда, гэта зараз амаль выключэнні, але пад'едзьце да іх, то можа нарэшце беларуская вёска не будзе паказвацца так як заўсёды.

— Як?

— Старыя бабкі на плоце. Мы таксама зараз будзем старыя, але ж маем XXI стагоддзе. Не кожная жанчына на вёсцы мусіць насіць хустку і выглядаць як усе жадаюць. Едзьце да пані Дароты.

Перад хатай, зразумела, лавачка, на ёй чатыры жартаўніцы.

— Так, Дарота ў хаце. Гэта мая нявестка, — адзываецца адна. Іншыя жанчыны ў першай хвіліне глядзяць падазрона, але вельмі хутка пераходзім да свабоднай размовы.

Праз момант ужо ў хаце крыху засаромленая пані Дарота, але з далікатнай усмешкай, адказвае на мае пытанні. Муж папівае каву і, відаць, аналізуе ўсё, пра што гаворым.

— Жывем на вёсцы, бо тут прыемна нам жывецца. Тут мы ў сябе. Запішамся беларусамі, бо так сябе адчуваем.

На канец, як аказваецца, найбольш нямкае пытанне.

— Здымак? Не ведаю, я не выглядаю добра на здымках, — бароніцца пані Дарота і глядзіць пытальна на мужа.

— Але няма Крыстыяна, а трэба было б зняць усю сям'ю, — рашуча адказвае ён.

У вясковым клубе знаходзім Крыстыяна, а з лавачкі клічам бабулю. Сям'я Венцкаў засела ў сваім улюбёным месцы для адпачынку на панадворку па-за хатай. Тры пакаленні за адным сталом, а аўтарскі загаловак здымка гучыць: „Мы з Крыўца. У перапісе 2011 года запішамся беларусамі".

ПЯТНІЦА 16 ліпеня

• 15.00 вернісаж выставы „Гарадок у Каро" (Фабрыка Каро)
• 16.00 сустрэча, прысвечаная асобе Тамары Саланевіч (Будынак старой вайсковай часці)
• 18.00 „Жэртва", фільм Тамары Саланевіч (Будынак старой вайсковай часці)
• 17.00 конкурсная частка
• 19.30 адкрыццё фестывалю
• 20.00 Zatoczka / BY • 21.00 Schody / PL • 22.00 Re1ikt / BY • 23.00 Аддіс Абэба / BY • 00.00 Rima / PL • 1.00 Lipali / PL • 3.00 DJ sety — Edemski

СУБОТА 17 ліпеня

• 15.00 сустрэча з Ігнатам Карповічам пад загалоўкам „Я нарадзіўся тут" (Будынак старой вайсковай часці) • 17.00 „Крэсавая балада", фільм Тамары Саланевіч (Будынак старой вайсковай часці)
• 16.00 вольная сцэна: CherryVata / BY, Open Space / BY, The Spouds / PL, Kuba rozpruwacz / PL
• 19.30 абвяшчэнне вынікаў конкурснай часткі + канцэрт лаўрэата
• 20.00 Gurzuf / BY • 21.00 :B:N: / BY • 22.00 Ляпис Трубецкой / BY • 23.30 Troitsa / BY
• 00.30 Litvintroll / BY • 1.30 Termin X / BY • 3.00 DJ sety — Hungry Hungry Models

НЯДЗЕЛЯ 18 ліпеня

chillout „Басовішча" — канцэрт • „Chciałbym uczestniczyć wypowiedzią" • удзельнікі майстэрні спеву • performance аматарскага тэатра • паказ фільмаў „Filmowe Podlasie Atakuje!"


9 770546 196000

# Прадказанні і прадказальнікі

Некаторыя людзі нават васьміногу Паўлю, які адгадаў хто стане чэмпіёнам свету па футболе, не вераць і ўсё спісваюць на звычайную выпадковасць. Маўляў, па законе вялікіх лічбаў ён яшчэ не набраў неабходнай колькасці сваіх гаданняў. Ёсць і такія, якія сцвярджаюць, што ўсё гэта махлярства. Усе прадказанні, нібыта, вызначылі вельмі таленавітыя спецыялісты па футболе, а васьміногу толькі заставалася па заранёў падкінутаму ў неабходную скрынку прысмаку паказаць на краіну пераможцу. Не бракуе і прыхільнікаў тэорыі, што васьміног Паўль усяго толькі зброя ў руках усёмагутнага Лёсу Лёсаў. І гэты Лёс Лёсаў проста хоча, каб людзі больш даверліва паставіліся да прадказанняў увогуле, бо на бліжэйшы час яны не вельмі цешаць чалавецтва.

Але не трэба быць ні Мішэлем Настрадамусам, ні жрацом народа майя, каб самому дакладна можна было зрабіць пару-тройку дакладных прагнозаў. Прыкладам, калі сёння ўверх па цячэнню рэчкі ідзе вялікі лівень, то заўтра, крыху ніжэй, мажлівы патоп. Ці, вельмі цікавае прадказанне беларускай палітычнай апазіцыі наконт нафты і газу, зробленае амаль дваццаць гадоў таму. Сутнасць яго заключаецца ў тым, што калі быць у закупках гэтых рэчаў прывязанымі толькі да адной крыніцы (у нашым выпадку Расіі), то гэтая крыніца праз нейкі час стане дыктаваць свае эканамічныя і палітычныя ўмовы. І тады, на першы погляд лёгкадаступныя газ ды нафта пойдуць бокам, але не тым, якім хочацца.

Прадказанне апазіцыі збылося. І зараз беларускі ўрад імкліва шукае выхаду з сітуацыі з энерганосьбітамі, і на кожным кроку ўжывае рыторыку апазіцыі дваццацігадовай даўніны пра тое, што трэба мець мінімум тры розныя крыніцы паставак гэтага тавару, інакш можна згубіць спачатку эканамічную, а пасля і палітычную незалежнасць.

Пры гэтым беларускі ўрад забываецца пра таго прадказальніка, які абяцаў нам залатыя горы, калі мы будзем вельмі моцна, аж да інтэграцыі, сябраваць з усходнім суседам. Зараз залатыя горы, ці калі выслаўляцца больш дасло́ўна, то чорныя азёры нам прадказваюць у тым выпадку, калі мы будзем сябраваць з Венесуэлай, Іранам, і яшчэ з пару-тройкай краін, з падобнай да беларускай палітычнай сістэмай.

Але гэтае прадказанне развалілася адразу пасля таго, як было зробленае. Адна падобная да беларускай палітычная сістэма з назвай Украіна не вельмі спяшаецца дапамагаць Беларусі ў транзіце венесуэльскай нафты па сваёй тэрыторыі. Прынамсі, не хоча гэтага рабіць на тых умовах, на якіх хоча Беларусь. А ўсё з-за таго, што яшчэ адна падобная на беларускую палітычная сістэма з назвай Расія мае свае ўнікальныя погляды наконт сяброўства брацкіх усходнеславянскіх народаў. І якраз вось тут атрымліваецца цікавая рагатка. Чыесці прароцтвы павінны не збыцца, бо беларускія ўладныя прадказальнікі прарочылі добрае жыццё ў сяброўстве з Расіяй. А расійскія — добрае жыццё ў складзе Расіі. І кожны біўся за сваё: за сяброўства, або за ўваходжанне ў склад, не зважаючы што ні тое, ні другое аніяк не можа беларусам прынесці трэцяга — добрага жыцця.

А зусім нядаўна адна славутая беларуская спявачка абуралася дзеяннямі АМАПу і ДАІ. На музычным свяце „Славянскі базар" беларускія АМАПаўцы зрабілі ёй заўвагу, што яна занадта развязна сябе паводзіць, выказваючы недапушчальныя, на думку АМАПаўцаў, эмоцыі пры сустрэчы з сябрам. А ДАІшнікі не давалі ездзіць там, дзе дазвалялі расійскім спевакам.

А што ж тут дзіўнага? Паводзіны АМАПаўцаў яна без падручніка магла і раней прадказаць, калі ў сваёй творчасці ні разу не абмовілася пра тое, як АМАП сябе паводзіць у дачыненні да апазіцыі. Усё лагічна. Дайшла чарга і да яе. Ну а наконт большай павагі да расійскіх спевакоў, таксама ўсё зразумела. Яны, як і яна, спяваюць па-руску. Толькі яны, у адрозненні ад яе, робяць гэта на роднай мове. Таму ім і павагі болей.

А для беларускамоўных выканаўцаў хутка будзе свой фестываль на Беласточчыне — „Басовішча-2010". І ў мяне ёсць да гэтай падзеі сваё прадказанне — там ніхто не зняважыць беларускага артыста. Асабліва слухачы, якія прыедуць сюды пачуць беларускую песню на сваёй мове, уцёкшы сюды і ад АМАПу, і ад ДАІ, і ад беларускіх рускамоўных спявачак.

**Віктар САЗОНАЎ**

# Галасуе Трасцянка

Не вельмі спякотны ліпеньскі дзень — неба зацягнута бурымі хмаркамі. 4 ліпеня. Па доўгай Трасцянцы, што раскінулася амаль у тры кіламетры, частка аўтамашын і веласіпедаў спыняецца каля святліцы. Тут выбарчы ўчастак. У першым туры на Браніслава Камароўскага свой голас аддало тут 88 чалавек, на Гжэгажа Напяральскага — 30, на Яраслава Качынскага — 29, на Анджэя Лепера — 10, на Вальдэмара Паўляка — 8, на Корвіна-Міке — 6, на Марка Юрка і Конрада Маравецкага — па 1, а Аляхоўскі і Зентак не атрымалі ніводнага голасу. Упаўнаважаных да галасавання было больш за 500 чалавек, галасы аддалі 175 асоб, 173 было важных бюлетэняў. Усе галасы праверыла Галя Тапалянская, якая вядзе сваю статыстыку. Сёння яна таксама з'ездзіць на веласіпедзе на ўчастак.

— Аддалі ўжо свае галасы? — пытаюся ў пяцёркі сядзячай за лавай пры краме Астроўкаў. Каштуюць халоднае піва.

— Выканалі свой грамадскі абавязак. О, мы цябе ведаем, ты з „Нівы"!

Адзін з прагаласаваўшых хоча абавязкова выказацца:

— Я паходжу з Трасцянкі. Чэга Яраслаў маё імя. Галасаваў на Камароўскага. Бо адна качка ўжо паляцела і ўпала. Усё. Без каментарыя, — і, даказаўшы сваю праўду, паказваецца такім якім ёсць: здымае кашулю для здымка: вось як выглядаюць трасцяніцкія хлопцы, якія не саромяцца сваіх поглядаў.

На прыгожай зялёнай машыне пад'язджаюць жыхары з Сакоў — дзядзька Ян Аўсяйчук з жонкай.

— Чаму прагаласуем? Трэба галасаваць. Мы за тое, каб было лепш. Маем надзею, што будзе лепш. Калі б не было надзеі, жыць не варта было б.

Яны ўжо пенсіянеры. Вядуць гаспадарку, як і раней: „Далей цягнем. Трохі робімо!"

З участка цяжка выкочваецца старэнькі чалавек.

— Прагаласаваў, на таго, каго хацеў. Маю права на тое, каб выказацца. Ці будзе лепш, не ведаю, рознае гавораць што будзе, а ўсяляк бывае. Ды хоць у мяне сумленне чыстае, што выкарыстаў сваё права на тое, каб выказацца, нават калі гэта не спадабаецца.

— Дык чаму ж не выказаліся за тое, каб Трасцянцы вярнуць яе старую, беларускую назву?

— Ідзі ты! Мяне тады на сходзе не было.

Галя Тапалянская вядзе ровар па ўтравелым, выбоістым тратуары.

— Усе радныя абяцалі штосьці з гэтым зрабіць. Апошняя радная дбае толькі пра свой агародчык. Будуць выбары самаўрадавыя, людзі павінны падумаць, на каго аддаць свой голас.

На сустрэчы з войтам, які тлумачыў трасцянцам бязглуздасць вяртання старой назвы Трасцянцы, радная падтаквала валадару гміны і ганарылася тым, што прывезлі ў святліцу ўсіх жыхароў, нават зусім нямоглых, каб маглі выказацца гуртом за невяртанне сапраўднай назвы: „Найгорш будзе з вашымі дакументамі! І колькі будзе работы для адміністрацыі!"

— Якая прыгожая вёска! — пахваліў пан Міхал, які з жонкай Анэтай прыехаў на Беласточчыну аж з Буска-Здрою і спыніліся яны каля хаткі Юркі Міхальчука, звабленыя колішнім выглядам дома і падворка ды рукадзеллем, якое можна купіць проста з вуліцы.. — І людзі тут напэўна талковыя, як на ўсёй Беласточчыне. І як бедная Беласточчына памагла нам на поўдні, тым, што пацярпелі ад паводкі! Мільён далі! І зноў дажджы лупяць у нас. А тут хораша.

Хто заехаў на ўчастак зранку, яшчэ з касцёла або царквы, хто вярнуўшыся з грыбоў. Не вельмі ўрадзілі лісічкі — у нас якраз сухавата ў ліпені...

У гэты нядзельны дзень на галасаванне ў Трасцянку прыбыло на ўчастак 204 асобы. Тры асобы ўкінулі няважны бюлетэнь — паставілі крыжык пры абодвух кандыдатах на прэзідэнта Рэчы Паспалітай або не памецілі ні аднаго. 41 асоба выказалася за Яраслава Качынскага, 160 — за Браніслава Карамоўскага.

**Міра ЛУКША**

**Вачыма еўрапейца**

# Стратэгічнае дзеянне

Дзень пасля прэзідэнцкіх выбараў дэпутат Роберт Тышкевіч, да нядаўняга часу старшыня падляшскай ГП, намеснік старшыні сеймавай камісіі замежных спраў і шэф парламенцкай групы па справах Беларусі склікаў прэс-канферэнцыю. Паінфармаваў, што перадаў прэзідэнту-электу запрашэнне наведаць рэгіён паўднёва-ўсходняй часткі Беласточчыны, а асабліва Чыжоў, дзе Браніслаў Камароўскі перамог павальнай перавагай галасоў.

— Розніца паміж Яраславам Качынскім і Браніславам Камароўскім у нашым рэгіёне склала 4 працэнты [перамог тут былы прэм'ер ад ПіС — М. Х.]. На папярэдніх выбарах розніца паміж Лехам Качынскім і Дональдам Тускам склала 27%. Нельга ўжо гаварыць аб нейкай радыкальнай перавазе на Падляшшы прыхільнікаў IVРП, — ганарыўся дэпутат і адзначыў: — Я хацеў бы асабліва падзякаваць выбаршчыкам з гмін паўднёва-ўсходняй часткі рэгіёна. Там зафіксаваны былі агульнапольскія рэкорды, калі гаворка пра падтрымку Браніславу Камароўскаму. І гэта невыпадкова. Чыжоўская гміна з'яўляецца агульнапольскай рэкардсменкай калі гаворка пра падтрымку Браніславу Камароўскаму [падтрымала яго тут аж 93% выбаршчыкаў — М. Х.]. Падобнае адбылося ў Арлянскай [92% — М. Х.] і Гайнаўскай [91% — М. Х.] гмінах.

На думку дэпутата Тышкевіча, гэты вынік не з'яўляецца эфектам выключна выбарчай кампаніі, але — як адзначыў — чатырохгадовай працы падляшскай ГП:

— Чатыры гады таму ГП пад маім кіраўніцтвам рашыла стратэгічна адкрыцца на асяроддзі звязаныя з праваслаўем і шырэй на асяроддзі звязаныя з нацыянальнымі меншасцямі. Тут, у гэтым рэгіёне, выбарчы лозунг Браніслава Камароўскага „Згода будуе" мае свой асаблівы сэнс.

Дэпутат тлумачыў у чым на працягу апошніх чатырох гадоў заключалася „прыцягванне меншаснага электарата да ГП":

— На практычных дзеяннях, між іншым на запрашэнні прадстаўнікоў меншасці да кіравання. Так было ў Беластоку. У Гайнаўскім ці Бельскім паветах узнікла шмат інвестыцый за еўрасаюзныя сродкі. Раней гэтыя абшары часта дыскрымінаваліся. Удалося прыцягнуць таксама на гэтыя абшары інвестараў, напрыклад, у Арлянскай гміне. Аказалася, прыгранічныя гміны на Падляшшы ў інвестыцыйным плане не з'яўляюцца страчанымі.

Дадаў:

— Польская ГП павінна гэтую плынь прыцягвання працягваць і ўтрымаць гэты цэнтравы курс, бо, як відаць, здае ён выбарчыя тэсты, а супрацоўніцтва з меншаснымі асяроддзямі для такой цэнтрысцкай партыі мусіць быць пастаянным і стратэгічным заданнем. Думаю, што такое дзеянне прынясе таксама вынікі на найбліжэйшых самаўрадавых выбарах. Мы ўжо размаўляем з меншаснымі асяроддзямі аб супольных выбарчых спісках, аб супольных кандыдатах.

Калі ў час прэс-канферэнцыі я слухаў дэпутата Тышкевіча, не мог утрымацца ад уражання, што асабліва ў моманты, калі падкрэсліваў ён свае заслугі „ў прыцягванні меншасных асяроддзяў да ГП", мае на думцы штосьці яшчэ, штосьці схаванае па-за словамі. У маёй памяці стаіць яшчэ ягоная сітуацыя ў падляшскай Платформе і адхіленне яго ад старшынявання яе структурам і вынік партыйнага суда, які мае вырашыць аб тым як гэта сталася, што ў час рэгіянальных выбараў улад ГП (выйграў іх дэпутат Дам'ян Рачкоўскі) некалькі тыдняў таму ў выбарчай урне апынуліся дадатковыя бюлетэні якраз з прозвішчам Роберта Тышкевіча. 11 ліпеня Роберту Тышкевічу быў адмоўлены ўезд у Беларусь. Ехаў ён з афіцыйнай парламенцкай дэлегацыяй на консульскай аўтамашыне на ўрачыстасці звязаныя з 66 угодкамі Акцыі „Вострая Брама". Паінфармавалі яго, што згодна з Жэнеўскай канвенцыяй, ён з'яўляецца асобай нежаданай у Рэспубліцы Беларусь. Больш пра гэта на 10 старонцы.

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

# Маршалак (Дважанскі) адбіў град

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

**Рэканструкцыя бітвы з часу Вялікай вайны з Тэўтонскім ордэнам (штурм града), паказы рыцарскіх сутычак, майстар-класы па лучніцтве і рамёствах, канцэрты даўняй музыкі, між іншым з энтузіязмам прынятага „Старога Ольсы" з Мінска разам са спадарожнічаючым яму Тэатрам танца „Яварына" ды феершоў, склаліся на двухдзённае мерапрыемства пад лозунгам „Канцэнтрацыя войск Вялікага Княства Літоўскага. Грунвальд 1410-2010".**

Імпазантныя паказы, выклікаючыя сярод тлумаў гледачоў захапленне і проста энтузіязм, сарганізавалі Падляшская маршалкоўская ўправа (перш за ўсё дэпартамент культуры і нацыянальнай спадчыны з яго дырэктарам Анатолем Вапам) разам з Падляшскім музеем ды пад вокам гісторыка Алега Латышонка. Патранат над імпрэзай трымалі міністры культуры Польшчы, Беларусі і Літвы, а сярод арганізатараў апынуліся Гістарычны музей у Троках у Літве і Культурны Цэнтр Беларусі. Падзеі звязаныя з „Канцэнтрацыяй..." пачаліся ў Беластоку спякотным адвячоркам у суботу 10 ліпеня з шэсця рыцараў і іх дам з Беларусі, Літвы і Польшчы — у строях эпохі сярэднявечча, таксама татарскіх і крыжацкіх — ад каталіцкай кафедры да пляца перад Ратушшу. Публіка прымала іх воплескамі. На ратушным пляцы дайшло да некалькіх рыцарскіх сутычак. Раней гледачоў прывітаў падляшскі маршалак Яраслаў Дважанскі:

Маршалак Дважанскі (трэці справа) вядзе войска ВКЛ на град

Падляшскі дэпутат Роберт Тышкевіч, намеснік старшыні камісіі замежных спраў у сваю чаргу зачытаў пасланне ад віцэ-міністра культуры Польшчы Пятра Жахоўскага:

— Бітва пад Грунвальдам гэта не толькі вялікая палітычна-мілітарная перамога, але і важны элемент польскай нацыянальнай тоеснасці.

На яго думку, мерапрыемствы, звязаныя з канцэнтрацыяй войскаў у цяперашнім Падляшскім ваяводстве „ўпішуцца ў будаванне дыялогу паміж народамі, якія шэсцьсот гадоў таму змагаліся за свабоду і незалежнасць".

Ваяры разыгралі некалькі сутычак, а „Стары Ольса" праспяваў старадаўнія песні, між іншым на хвалу князя Вітаўта і аб змаганнях на палях Грунвальда. Мінскі калектыў падняў таксама гледачоў да сярэднявечных скокаў. На наступны дзень найважнейшым пунктам імпрэзы было здабыванне спецыяльна збудаванага ў падбеластоцкім Музеі вёскі драўлянага града. Была гэта пастаноўка адбіцця брэсцкай крэпасці, якую занялі былі крыжаносцы. Войскамі Вялікага Княства Літоўскага кіраваў апрануты ў сярэднявечнае адзенне вяльможнага ваяра, з булавай, а пасля з мячом у далоні маршалак Яраслаў Дважанскі, які вёў сваіх падначаленых у бітву. Беларускія ваяры (да бітвы ўздымаў іх Фёдар Малахееў, старшыня Згуртавання рыцараў ВКЛ у Беларусі) здабывалі град м.інш. прывезенымі спецыяльна для гэтай нагоды таранамі. Са сцен крэпасці лілася вада, палалі асадныя гарматы, сыпаўся дождж стрэл з лукаў, ворага атакавалі „татары" на конях, раўлі гарматы... Урэшце, як у гісторыі, крыжаносцы здаліся. Рыцары з Польшчы, Літвы і Беларусі (было іх у час імпрэзы найбольш, бо больш за 150 ваяроў) з каля трыццаці рыцарскіх клубаў, у Музеі вёскі правялі шмат бітваў адзін на аднаго, што лёгкім не было ў даспехах вагой у 30-40 кілаграмаў. Заўважылі мы нават аднаго ваяра, які ад спякоты самлеў, ды праз пару хвілін прывяла яго ў прытомнасць ягоная дама ў сярэднявяковых цюлях, і стаў на ногі.

Выступаюць „Стары Ольса" з моладдзю з АБ-БЫ

Мінская моладзь (з маршалкам Дважанскім) на фоне сваёй карціны

— „Канцэнтрацыя..." — гэта крыху гісторыі, крыху забавы, крыху добрай музыкі.

На гісторыю спаслаўся Ігар Чарняўскі з міністэрства культуры Беларусі, які зачытаў пасланне ад кіраўніка гэтага ведамства Паўла Латушкі:

— Гэтая адлеглая бітва з'яўляецца нам доказам таго, якія вялікія магчымасці дае спалучэнне сілаў, ведаў і талентаў не толькі на полі бою, але і ў штодзённай працы. Памяць аб геройстве нашых продкаў з'яўляецца падставай для супрацоўніцтва міністэрстваў культуры Рэспублікі Польшчы, Рэспублікі Літвы і Рэспублікі Беларусь. Выказваю надзею, што ўжо неўзабаве зможам пачаць рэалізацыю трохбаковых праектаў датычных увекавечання вялікіх старонак нашай супольнай гісторыі, захавання нашай супольнай спадчыны і захавання культур нашых народаў. Гісторыя нас яднае.

Здабыццё града зноўку пяпярэдзілі выступленні „Старога Ольсы", са спевамі моладзі са Згуртавання АБ-БА і іншых калектываў. Былі таксама паказы рамёстваў і навідавоку варыліся сярэднявечныя стравы. Дзейнічала спецыяльная Конная рыцарская пошта, якая перамяшчала пасылкі на шляху ад Паштовай установы па вуліцы Варшаўскай у Беластоку ў паштовы пункт у Музеі вёскі (пасля, вядома, адасланыя адрасатам). Адкрытая была карціна „Грунвальд-2010" памерамі 7,5 на 3 метры, выкананая ў казачных колерах і ў сучаснай стылістыцы вучнямі Мастацкага ліцэя ў Супраслі, Мастацкага каледжа ў Мінску і Дзяржаўнай мастацкай школы імя Чурлёніса ў Вільні. Трапіць яна ў галерэі ў Мінску і Вільні, а пасля вернецца ў Беласток.

— Я не знаток сучаснага мастацтва, але інтуітыўна адчуваю, што можа яна падабацца, — сцвердзіў пасля акдрыцця карціны маршалак Дважанскі.

— Гляджу на „Канцэнтрацыю.." як на культурную падзею, а не на ўспамін таго, як мы ўлупілі немцам! — захапляючыся паказамі, сказаў Алег Латышонак. — Гэта для нас забава, але і ўспамін нашай гісторыі, калі мы, русіны, беларусы ды палякі і літоўцы былі супольнасцю. Файнае асабліва тое было, што ў той час не стаялі паміж намі межы.

Патранат над „Канцэнтрацыяй..." трымала „Ніва".

# Прэмія Канстанціну Майсеню — згода ёсць, але ці ўганаруюць?

5 ліпеня выконваючы абавязкі прэзідэнта Польшчы Браніслаў Камароўскі падпісаў згоду на прысваенне Канстанціну Майсеню — дзеячу беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, узнагароды Рэспублікі Беларусь у галіне культуры — ордэна Францыска Скарыны.

З ініцыятывай прысвоіць Канстанціну Майсеню найвышэйшую ў галіне культуры ўзнагароду Рэспублікі Беларусь выступіў у 2006 годзе тадышні амбасадар Беларусі ў Польшчы **Павел Латушка**. Амбасадар асабіста наведаў Канстанціна Майсеню ў бальніцы, калі гэты апошні быў ужо цяжка хворы.

— Канстанцін Майсеня, — сказаў нам Павел Латушка, — гэта выключная асоба для беларускай культуры і беларускай грамады ў Польшчы. Цяжка пераацаніць той уклад, які ён унёс у развіццё і захаванне беларускай культуры і спадчыны на Падляшшы. Вельмі важнае, што хацелася б успомніць зараз — гэта пабудова Музея і цэнтра беларускай культуры ў Гайнаўцы. Гэта сапраўды важны аб'ект не толькі беларусам у Польшчы, але, як мне асабіста падаецца, ён важны і шырэй. Што тычыцца дзяржаўных узнагарод, дык калі мне прыйшлося працаваць амбасадарам Беларусі ў Польшчы, з нашага боку была высунута ініцыятыва ўзнагароджання Канстанціна Майсені медалём Францыска Скарыны. На жаль, даволі доўга давялося чакаць гэтай згоды і рашэнне было прынята, як я разумею, толькі пасля яго смерці. Што тычыцца ўсіх дзяржаўных узнагарод, якія ўручаюцца ў Рэспубліцы Беларусь — у тым ліку як для грамадзян Беларусі, так і для замежных грамадзян — гэта з'яўляецца выключнай кампетэнцыяй прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Толькі прэзідэнт мае права прыняць рашэнне аб узнагароджанні той ці іншай асобы дзяржаўнай узнагародай.

Павел Латушка, які актуальна з'яўляецца міністрам культуры Рэспублікі Беларусь, лічыць, што незалежна ад таго ці жыве чалавек, ці не, але грамадства даведаецца, што Канстанцін Майсеня такую ўзнагароду заслугоўвае.

**Валянціна Шыбетнік**, намесніца загадчыка адзела дзяржаўных узнагарод у Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, выказала аднак іншую думку, паводле якой справа з уганараваннем заслугаў Канстанціна Майсені ў галіне беларускай культуры не такая ўжо і простая — беларуская практыка не прадугледжвае ўзнагароджваць ордэнам Францыска Скарыны пасмяротна:

— На жаль, у нас не практыкуецца пасмяротнае ўзнагароджванне. Яно можа быць толькі ў тых выпадках, калі справа тычыцца таго, што чалавек вось цяпер здзяйсняў і дзейнасць тую абарвала смерць. Ва ўсіх іншых выпадках пасмяротна людзі не ўзнагароджваюцца. Гэта было тады [ініцыятыва ўзнагародзіць К. Майсеню — рэд.], калі чалавек жыў і чамусьці — я не ведаю чаму — прапанова гэтая не была падтрымана тады...

**Валянціна ЛАЕЎСКАЯ, Аляксандр МАКСІМЮК, Радыё Рацыя**

Фота архіў „Нівы"

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

# Там „Купалінка" і тут „Купалінка"

*На купальскія мерапрыемствы прыбыла шматлікая публіка (на першым плане ў Ляневе танцавальны калектыў „Перапёлка" з ГДК)*

**Так разважалі жыхары Гайнаўшчыны, якія 10 ліпеня рашыліся наведаць беларускі купальскі фэст. Купаллі ў Ляневе Чыжоўскай гміны і ў Нараўцы праходзілі ў сонечнае і вельмі цёплае надвор'е. Менавіта купальскім традыцыям характэрная была пашана для сонца. Людзі верылі ў яго незвычайную моц, бо сонца з дажджамі спрычыняліся да добрых ураджаяў. Пра сёлетнія прадбачваныя плёны збожжа можна было паразмаўляць з вясковымі людзьмі, якіх шмат сабралася побач Лянева, вёскі распаложанай у сельскагаспадарчай Чыжоўскай гміне з вельмі якаснымі землямі. Аднак якраз у наваколлі Лянева земля горшай якасці і таму быў тут цэнтр вырошчвання трускалак, якіх прадукцыя разам з гадоўляй быдла кампенсавала горшыя прыбыткі з прадукцыі збожжа і бульбы. Ужо сёмы раз побач Лянева быў ладжаны фэст „Купалінка". Гэтая традыцыя была ўстаноўлена тут якраз не па сельскагаспадарчых прычынах, а з-за невялічкай рэчкі Локніцы і мінівадасховішча, дзякуючы якім стварылася магчымасць арганізаваць тут адпачынак не толькі ў пачатку ліпеня, але на працягу ўсяго лета.**

## *У сямейнай атмасферы*

Едучы ў Лянева было відаць, што збожжа ўвайшло ўжо ў перыяд даспявання. У мінулым, калі збожжа ўбіралі снопавязалкамі або яшчэ раней, сярпамі, часта ў Пятроў пост распачыналася ўжо жніво. Зараз збожжа расце даўжэй і чакае, покі на палі не выедуць камбайны. Па дарозе ў Чыжы было відаць прыгожае збожжа, але ў многіх месцах пшаніцу прыкрыла мятліца.

— Вясной і раннім летам было многа дажджоў і таму вырасла так высокая і густая мятліца. У мяне ў пшаніцы яна таксама расце. У гэтым годзе мятліца вырасла нават у нашых буйных земляробаў, якія апырскваюць збожжа ад пустазелля па некалькі разоў, хаця, зразумела, у іх яго намнога менш, чым у нас, традыцыйных гаспадароў, — заявіць пазней спадар Якімюк з калектыву „Чыжавяне", якія як гаспадары адкрывалі „Купалінку". — Частка азіміны сёлета сапрэла, бо зімой доўгі час ляжала тоўстае снежнае покрыва і мне прыйшлося адараць частку трыцікале і пасеяць на яго месцы мяшанку. Жыта сёлета мала рунела, то і колас слабейшы, чым быў у мінулых гадах, а ярына таксама крыху слабейшая, чым была раней.

На Купалле людзі пачалі прыязджаць яшчэ да асноўнага мерапрыемства і адразу маглі падмацавацца харчаваннем і напіткамі, а дзеткі — ласункамі. Мерапрыемства адкрыў войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк, які пасля ўручаў ганаровыя граматы і дзякаваў шматлікім спонсарам, што ўспамагалі „Купалінку" і ўспамагаюць гміну ў іншых патрэбах.

— Наш войт гаспадарлівы і многа робіць у нашай гміне. Гэтае невялікае вадасховішча таксама будавалася ўжо пры ім. Тут турыстычная дзейнасць магла б яшчэ больш разгарнуцца, але ўласнік прыватнага ўчастка, распаложанага ў зручным месцы побач вады, многа хоча за яго продаж і таму ён надалей застаецца ў прыватных руках, так як і многія іншыя ўчасткі вакол вадасховішча, — кажа жыхарка Чыжоў, якая з мужам прыехала на фэст.

Калі на сцэне выступалі гаспадары — „Чыжавяне" і спевакі са школьнага калектыву „Лясная гавэнда" з Чыжоў, а таксама спевакі і танцоры са Студыі песні і калектыву „Перапёлка" з Гайнаўскага дома культуры, сярод публікі было многа сямействаў. Наймалодшыя гулялі ў дзіцячым гарадку і ездзілі на машыне, якую прывезлі пагранічнікі з Белавежы. Можна было таксама паглядзець на абсталяванне пажарных машын і прыняць удзел у конкурсах. Паколькі мерапрыемства праходзіла ў месцы, дзе яшчэ і зараз вырошчваецца многа трускалак, трэба было, між іншым, як мага хутчэй з'есці порцыю гэтых жа трускалак, якіх ураджай у гэтым годзе быў горшы, чым у мінулых гадах. Увесь час на мерапрыемстве людзей большала і пасля перад даволі вялікай публікай выступілі „Жэмэрва" са Студзіводаў, „Крыніца" з Беластока, калектыў „Нарва" з Нарвы і „Дэкада Бэнд" з Бельска-Падляшскага. Зоркай купальскага мерапрыемства быў калектыў „Купалінка" з Мінска. Увагу публікі прыцягнулі таксама феерверкі. Канешне, самым важным момантам у час купальскага мерапрыемства было пусканне вянкоў па Локніцы.

## *Ноч спеваў і пускання вянкоў*

Ліпеньскае мерапрыемства, якое адбылося ў Нараўцы ў гэтую самую ноч, што ў Ляневе, называлася „Ноч Купалы «Купалінка» — ноч спеву і магіі". Аднак магія зводзілася ў агульным да пускання вянкоў па Нараўцы і пасля вылаўлівання іх з вады.

— Наш вянок мы выконвалі сёння, у галоўным з палявых кветак, так як было ў мінулым. Зараз побач Нараўкі пустуюць многія лугі і там расце шмат кветак. Вянок мы прыдумалі ў выглядзе сонца і таму ў ім многа жоўтых кветак. Мы адчуваем сябе гаспадарамі мерапрыемства і таму хацелі, каб наш вянок быў найпрыгажэйшы, — заявіла пасля ўдалых выступаў на сцэне Вольга Савіцкая, кіраўнік „Нараўчанак". Спявалі яны ў саставе папоўненым дзяўчатамі з Навасадаў, паколькі музычным апекуном абедзвюх груп з'яўляецца вядомы музыкант Пётр Скепка. Пусканне вянкоў па Нараўцы адбывалася побач яцвяжскіх стаўбоў, якія гарэлі як велізарныя факелы.

— Нам не падабаецца, што не даюць нашым вянкам адплыць па Нараўцы далей. Каб яшчэ маладыя хлопцы іх вылаўлівалі, а гэта старэйшыя мужчыны ўжо загадзя чакаюць каля вады, каб ускочыць у яе і як мага хутчэй выцягнуць нашы вянкі, якія мы так доўга выконвалі. Тады са сваімі сябрамі дзеляцца яны кветкамі, разрываючы вянок на маленькія кусочкі, — тлумачыла спадарыня Савіцкая.

Іншых засцярог да ходу мерапрыемства не было. Наадварот, сабраныя хвалілі яго, так як жыхары Чыжоўскай гміны „Купалінку" ў Ляневе. Калі параўнаць абодва мерапрыемствы, колькасць публікі на іх была падобная. Можа ў Нараўцы было менш гастранамічных прапаноў, чым у Ляневе, але тут насупраць амфітэатра знаходзіцца рэстаран, дзе можна выпіць каву ці халодны напітак і седзячы за столікам на свежым паветры слухаць беларускія песні, з якімі выступалі выканаўцы. Апрача „Нараўчанак" на вялікай сцэне ў амфітэатры спявалі „Маланка" з Бельска-Падляшскага, калектыў Белавежскага асяродка культуры, „Арт Пронар" з Нарвы, „Цаглінкі" з Ляўкова, „Асенні ліст" з Гарадка, „Сервіс" і „Зорка" з Беластока. Так як і ў Ляневе зоркай фэсту быў калектыў „Купалінка" з Мінска (прыбыў на запрашэнне БГКТ), які на абодвух мерапрыемствах захапіў публіку. Хаця ў Нараўчанскай гміне маладое пакаленне намнога больш польскамоўнае, чым у Чыжоўскай гміне, то іх зацікаўленне беларускімі песнямі яшчэ не загасла.

— Мы заўсёды ладзім Купалле ў другую нядзелю ліпеня, пасля белавежскага, і карыстаецца яно вялікім зацікаўленнем. Я лічу, што сёння жыхары нашай гміны састаўляюць каля паловы публікі, а апошняя частка, гэта турысты і прыезджыя з іншых гмін, — заявіў войт Нараўчанскай гміны Мікола Павільч, які адкрыў мерапрыемства. Аднак яшчэ да гэтага вуліцамі Нараўкі прайшоў карагод, які састаўлялі беларускія калектывы. Неслі яны вянкі, якія расставілі перад сцэнай. Толькі пры канцы мерапрыемства пускалі іх на ваду ў прысутнасці шматлікай публікі, феерверкаў і яцвяжскіх факелаў. Арганізатарамі абодвух мерапрыемстваў былі войты і мясцовыя асяродкі культуры.

**Лік уніяцкага насельніцтва ў Суражы пастаянна падаў, а запар з гэтым працэсам хілілася і суражская царква; ужо ў пачатку XIX ст. была гэта хіліна пад саламянай страхой. З адменай уніі паявілася агітацыя за праваслаўем і адным з яе рупліўцаў быў суражскі праваслаўны настаяцель Канстанцін Пракаповіч. 23 мая 1863 года мясцовыя паўстанцы, магчыма за намовай ксяндзоў Крынскага і Мараўскага, павесілі Пракаповіча, які тыдзень раней угасціў атрад царскага войска пасля перамогі над мяцежнікамі...**

Фота Міры ЛУКШЫ

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

# ВАКОЛ СУРАЖА (2)

*Сквер у Суражы, дзе стаяла мураўёўская царква*

„Вестникъ Западной Россіи" з 1867 года так пісаў: „Въ 35-ти верстахъ отъ уезднаго города Белостока, а въ 5-ти верстахъ отъ границы Царства Польскаго, находится заштатный, довольно многолюдный г. Суражъ, разделенный рекою Наревомъ на две части. По сведениямъ, заимствованнымъ мною изъ архива Суражской ратуши и статистики Гродненской губерніи Бобровскаго, в Сураже когда-то было отъ 5-ти до 7-ми православныхъ храмовъ. Но над Литвою промчалась польско-іезуитская язва, и Суражъ, подобно многимъ городамъ испыталъ одинаковую съ ними печальную участь. Храмы уничтожены, православные жители сего города большею частію совращены въ латинство. Уцелела какими-то судьбами ветхая, бедная церковь, крытая соломою — хуже всякой крестьянской избы. До последняго мятежа никто не обращалъ вниманія на такое уничиженіе здесь православія, на эту изумительную бедность нашей церкви. Только страдальческая кончина нашего священника Константина Прокоповича, убитаго мятежниками въ 1863 году, обратила взоры великороссіянъ на эту забытую местность. Бывший главный начальникъ здешняго края, графъ Михаилъ Николаевичъ Муравьевъ, задумалъ возстановить въ Сураже православную церковъ и съ этою целью ассигновалъ три тысячи рублей серебромъ. Хотя суммы сей было недостаточно, но на помощь доброму делу нашлись добрые люди — ревнители веры. Особое усердіе къ устройству новой церкви оказалъ достопочтенный братчикъ суражскаго прихода, его превосходительство д. ст. советникъ Владимиръ Николаевичъ Карамзинъ. Онъ исходатайствовалъ у министерства три тыс. руб., отъ себя пожертвовалъ тысячу руб., и почти все необходимыя для церкви вещи. За выше упомянутую сумму въ 1865 начата, а въ настоящемъ 1867 году окончена небольшая, но благолепая каменная церковъ, на высокой местности, при реке Нареве. Особенно изящна колокольня. Внутри церкви, иконы превосходной живописи; между ними особенно замечательны — иконы драгоценныя Нерукотвореннаго Спаса, пожертвованная незабвенной памяти Наследникомъ Цесаревичемъ и Великимъ Княземъ Николаемъ Александровичемъ, и другая въ олтаре, на горнемъ месте, изображающая Господа Іиуса, сидящаго во славе, пожертвованная служителями большаго Московскаго театра, въ память спасенія драгоценной жизни нашего Государя, въ 4 день апреля 1866 года. Да, кстати сказать здесь несколько словъ о сихъ бедныхъ людяхъ. Ими пожертвованы различныя церковныя вещи на сумму 500 руб. и два небольшия колокола. Честь имъ и слава! Самимъ деломъ они доказали, что любятъ благолепіе дома Божія. Торжество освященія новоустроенной церкви происходило 3-го сентября, въ день воскресный. На кануне сего церковнаго праздника прибыли въ Суражъ супрасльскаго монастыря архимандритъ Викентій, белостокское соборное духовенство, несколько сельскихъ священниковъ и маститый архипастырь нашъ, преосвященный Игнатій, епископъ брестскій. Въ 6 часовъ вечера началось всенощное бденіе, которое отличалось особою торжественностью... (...) На другой день, въ половине 10-го часа, начался торжественный обрядъ освященія церкви — во имя Преображенія Господня. Это торжество почтилъ своимъ присутствиемъ г. гродненский губернаторъ, генералъ-маіор Скворцовъ. Присутствовали также при богослуженіи: белостокскій уездный предводитель, дворянства д. с. Трохимовскій, мировые посредники и другіе великорусскіе деятели, разделившіе нашу радость — торжество нашей веры. (...) После литургіи, присутствующимъ на празднике, въ доме местнаго священника Котовича, данъ былъ обедъ. Первый тостъ, какъ всегда бываетъ, провозглашенъ былъ за здоровье обожаемого нашего Монарха и Царствующій Домъ; второй — за здоровье строителя храма Владимира Николаевича Карамзина и другихъ благотворителей, третій — за здоровье преосвященнаго Игнатія, епископа брестскаго и г. начальника гродненской губерніи. Дружное и громкое „ура!" было ответомъ на предлагаемые тосты, а хоръ архіерейскихъ певчихъ стройно пелъ „многая лета"! Такъ провели мы торжественный праздникъ — освященіе въ Сураже православной церкви".

Пра далейшы лёс праваслаўя ў Суражы піша а. Рыгор Сасна: „W 1915 r. cerkiew w Surażu podczas działań wojennych została uszkodzona. Tego roku doszło do masowego uchodźstwa prawosławnej ludności (...) w głąb Rosji. Parafia przestała istnieć, a grunta cerkiewne — 51 ha — przeszły w posiadanie Skarbu Państwa. W 1929 r. cerkiew została rozebrana, a cegłę zużyto na remont kościoła parafialnego. (...) Na miejscu cerkwi w 1930 r. postawiono pomnik upamiętniający dziesiątą rocznicę odzyskania niepodległości, a na placu urządzono skwer. (...) Faktycznie już w okresie międzywojennym wszelkie ślady prawosławia zostały zlikwidowane. Po II wojnie światowej jedynie cmentarz w opłakanym stanie przypominał o istnieniu tu obrządku wschodniego".

Згаданыя могілкі, побач шашы ў Завыкі, яшчэ захаваныя, у плачэўным стане. Ачышчаныя з кустоўя некалькі гадоў таму, зараз зарастаюць буйной травой, з якой выглядае выкананы з рэек крыж з перакосінай. Гэтая некраполія пазначана яшчэ на малалікіх мапах...

У самім Суражы зараз некалькі музеяў, бадай пяць. Вось у адзін такі, Музей каплічак, прабаваў я заглянуць. Але вакол таго музея не было відаць жывой душы, гэтак жа як і вакол іншага невялічкага музея, на падворку якога ляжаць каменныя пліты, а ад вуліцы запрашае дэмбельная радарная антэна. Дарэчы, у Музей каплічак не так варта і заглядаць, бо ўжо на суседніх дамах відавочныя даволі цікавыя гэтыя аб'екты.

Насупраць вёскі Канцавізна, што на колішнім урочышчы Маслаўка, у двух кіламетрах на ўсход ад Суража, два крыжы; адзін з іх прыбраны каляровымі стужкамі, так як робяць гэта нашы католікі. Аднак на абодвух кірылічныя надпісы; значыць адбываецца тут маскіроўка каб прыкінуцца, што і гэтая вёска ідзе за духам часу.

Перад Завыкамі, па дарозе ў прысёлак Завыкі-Ферма, школьны будынак. Агароджа з драцяной сеткі закіданая яшчэ і голлем так, што я ледзь пралез на школьны панадворак. Школа ўжо не працуе, але нейкі гаспадар там ёсць.

Сама вёска Завыкі нагадвае зараз Беласток, вуліца там поўнасцю раскапаная, пакладзены новыя, высокія бардзюры, але брук яшчэ ляжыць; мабыць неўзабаве ляжа на ім слой асфальту. На ўсходнім канцы вёскі майстэрня, дзе выконваюцца розныя буйныя драўляныя фігуры. А на неабгароджаным пляцы гэтага прадпрыемства незвычайны звярынец — спакойна сілкуюцца траўкай лама і асёл. На мой від лама выканала падскок-рэверанс, а пачцівы асёл быў цалкам заняты сваім кансумерызмам — падскубваннем сакавітай траўкі.

Насупраць згаданай майстэрні стройная капліца з лістоўнічнай драўніны, пабудаваная, як падае сайт Беластоцкай архідыяцэзіі, 360 гадоў таму, значыць у палове XVII стагоддзя: „Była katolicką i posiadali ją unici, po likwidacji unii od 1867 prawosławni do 1918 r. Od tego czasu z małym wyjątkiem w latach 1940-41 była i jest katolicką, chociaż stanowiła własność gminy suraskiej. Dopiero w 1990 r. wykupiono ją i jest własnością parafii. (...) Odpust, na który przybywa z okolic nie mniej prawosławnych niż katolików, obchodzony jest w niedzielę po uroczystości Imienia Maryi".

Пра завыцкі храм піша і а. Рыгор Сасна: „Cerkiew w Zawykach w 1773 r. została rozbudowana, materiał na to uzyskano z rozebranej cerkwi w Bacieczkach. (...) Przy cerkwi była także kapliczka ze źródełkiem, a w niej Włodzimierska Ikona Matki Bożej. (...) Władze duchowne w Warszawie [у міжваенны перыяд — А. В.] monitowały do władz państwowych w sprawie otwarcia parafii w Zawykach (...), lecz bez rezultatu.

## *Дарагая Ніна*

*З нагоды 80-годдзя*
*Ніне Цыванюк прысвячаю*

Дзень — Твайго жыцця пачатак,
Дарагая Ніна —
Ён вялікае нам свята,
Свята ўспамінаў.
Што народ тварыў вякамі
Песні, пагаворкі
Тваймі слаўнымі славамі
Былі на вячорках.
Цешыла нас Твая песня,
Сэрцы паланіла —
Усе помняцца ад першай
Да расстання хвілі.
Успамінаем, дарагая,
Усе Твае канцэрты,
Бо ў душы нам залягаюць
Усё жыццё да рэшты.
Слухалі іх з захапленнем
У залах, на салонах.
Мы твае ўсе любіцелі,
Б'ем Табе паклоны.
Нашай песні беларускай
Дадала Ты крылаў
І ляцела з Тваіх вуснаў
У свет шырокі мілай.
Расталася з „Расспяваным" —
Час прыйшоў на гэта.
Зычым табе, дарагая,
На далейшы леты
Многа шчасця і здароўя,
Да суджанай мэты.

*Валілы-Станцыя, 21. 06.2010 г.*

**Анатоль ПАРЭМБСКІ**

## Каму паскардзіцца?

Аб чыгуначных абсурдах „Ніва" пісала неаднойчы. Але аб такім нават мне не снілася. А справа, даражэнькія, не такая ўжо банальная. Скажу проста — смярдзючая! У Кляшчэлях на станцыі разабралі нужнік на пероне. Мураваны, мабыць, збудаваны ў мінулым стагоддзі. Зараз чалавеку ў кусты трэба бегчы, якія мяжуюць са станцыяй. Прыгадваюцца мне дзевяностыя гады, калі ў Пяшчатцы (на беларускай мяжы) за елкамі хаваліся, бо не было там туалетаў. Але Кляшчэлі гэта не адкрытае поле, але мястэчка з традыцыяй. Дзе ж затым прагрэс цывілізацыі, дзе культура? Не магу ўцяміць, што на такое пагадзілася Рада горада і гміны. У Страблі, напрыклад, нужнікі па-даўнейшаму стаяць на пероне і служаць грамадскай справе. Няўжо ў Кляшчэлях жывуць іншыя людзі?

**(ус)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

# зорка

для дзяцей і моладзі

Фота Ілоны КАРПЮК

## Каляровы Крывец

— Другі тыдзень спевы нясуцца па нашай вёсцы, — радасна каментуюць жыхары вёскі Крывец, седзячы на лавачках. Зноўку ў тамашнім праваслаўным асяродку пасялілася беластоцкая моладзь з аб'яднання АБ-БА.

Пасля старэйшай групы на Нарваўскую зямлю з'ехалі вучні II-V класаў, якія цэлы школьны год вывучалі беларускую мову. Да дзевятнаццаці малышоў далучыліся Настка і Мішка, брат з сястрою з Варшавы, дзяды якіх, між іншым, з вёскі Сацы. Там менавіта ладзіўся адзін з першых аббаўскіх летнікаў. Усе яны стварылі даволі прыстойную каманду, якой займаліся тры апякункі.

— Пакласці спаць і дапільнаваць, каб усе выкупаліся перад сном ды памянялі на другі дзень выходжаную вопратку, гэта абавязковыя нашы задачы, — згодна кажуць апякункі. — А так, то самая прыемнасць, бо нашы дзеці ахвотна гулялі і займаліся тым, што мы ім прапанавалі.

А прапаноў сапраўды чакала шмат. Нумарам адзін у топ-спіску заняткаў стала вышыўка „Супермама" ды „Супертата".

— Гэтыя закладкі для кніжак я падрыхтаваў бацькам, бо яны любяць чытаць кніжкі, — кажа Грышка.

Апрача Грышкі шмат хто пацікавіўся такой формай вышыўкі. Але былі таксама іншыя задумы.

— Я вельмі хацеў мець такі мяшочак на тэлефон, — ледзь паспее злавіць паветра Матвейка, адзін з трох наймалодшых удзельнікаў летніка. — Але сам не ўмею, то пані мне памагла, але карцінку то ўжо сам вышыў!

Фота Ілоны КАРПЮК

— Некаторыя то столькі панавышывалі, але я думаю, што мы таксама многа, — сур'ёзна кажа мне Адрыян, выпускнік другога класа, — па адной вышыўцы, але затое на ёй цэлая карцінка! У мяне конь, сонца, хмарка і кветка, а ў Матвея — лодка на вадзе.

Першыя крокі хлопцаў можна палічыць удалымі, затое праца старэйшых гэта ўжо майстэрства. Беларускія народныя ўзоры, сэрцы, футбольныя лагатыпы, бо якраз адбываецца чэмпіянат. Амаль усё аздобленае каляровай паперай у якасці паштовак. Найбольш стойкія завяршалі майстэрскія працы пляценнем паяскоў пры дапамозе дошчачак. Да апошняй хвіліны плялі бранзалеткі ды іншыя традыцыйныя аздобы.

Край просты або ў выгладзе хвалі, з зубкамі або арыгінальны, задуманы самім аўтарам. Адзін блок заняткаў прысвечаны быў выцінанкам. Нельга сказаць, што дзеці павыцінаралі абрускі, але патэнцыял уяўлення ў фармаце А4 захапляў кожнага гледача, а перш за ўсё саміх дзяцей.

Фота Ілоны КАРПЮК

Крывец пакінулі яшчэ і з мастацкім выбарам жывапісных карцінак, але найпрыгажэй дзеці па-акцёрску намалявалі свет „Смяшынак" Віктара Шведа. Пакуль аднак усе паглядзелі цыкл сцэнак, удзельнікі летніка запрэзентавалі песні ды танцы перыяду Вялікага Княства Літоўскага пад музыку гурту „Стары Ольса". Нягледзячы на вялікую ўсхваляванасць, усе засяродзіліся на рытме, кроках ды чарзе, у якой трэба іх ставіць. Заахвочвалі іх бацькі і мясцовыя жыхары, якіх да смеху, а можа і да слёз, кранулі „смяшынкавыя" выступы ў канцы прэзентацыі.

— Адкуль, скажы нам, Міхасёк, мы маем электрычны ток? — пыталіся наймалодшыя акцёры.

Калі і вы не ведаеце, падкажу, як і падказаў Міхасёк. З Афрыкі. Найлепш ведае гэта дзедка, бо калі ў хаце патухлі электралямпачкі, менавіта ён сказаў: „Зноў малпы выключылі свет!"

Дзеткі рассмяшылі гледачоў так, што і бацькі на канец сталі жартаваць:

— Цешымся, што мы маглі тыдзень адпачыць ад дзяцей, — смяяліся пасля ўсіх атракцыёнаў.

Па шчырасці, яны вельмі за малышамі тужылі. Але пэўна праз год зноўку надумаюцца паслаць іх на летнік.

i_basovka@o2.pl

## Куды падзеліся дзеці?

— Дзе яны? Выдзьмула ветрам? — здзіўлялася Дарка.

Здаецца, Старое і Новае Ляўкова — вялікія вёскі, а на вуліцы пуста, няма ніводнага маладога чалавека. Калі мы выязджалі з пансіяната Бора-Здруй, думалі, што заедзем у вёску, сустрэнем дзяцей, паставім ім свае пытанні. Спытаем чым яны займаюцца ў вольны час, якія ў іх мары і планы, а пасля вернемся і напішам пра іх рэпартаж. Аднак нашы планы змяніліся. Мы праехалі праз абедзве вёскі (чатыры кіламетры) і не сустрэлі ніводнага дзіцяці. Па вуліцы хадзіў толькі вецер і дзядзькі, якім гэты вецер не дазваляў хадзіць проста.

Дзе шукаць маладых людзей? Мы рашылі заглянуць у святліцу.

— Закрытая! — крыкнула я, калі хацела адчыніць дзверы.

Іншае жывое месца ў вёсцы — крама. Але тут сярэдні ўзрост яе кліентаў аказаўся для нас крышку завысокі. Напэўна прадаўшчыца будзе ведаць куды падзеліся ўсе дзеці.

— Якія дзеці? Крыху іх ёсць, але не так многа як калісь. Некалькі гадоў таму ў Ляўкове закрылі школу, таму што людзі павыязджалі ў гарады. Гэтыя, што засталіся, у свабодны час лепяць гліну і носяць цэглу.

— Можа паедзем у Плянту? Можа там будуць дзеці? — прапанаваў Мішка, наш вадзіцель і апякун.

Ну дык паехалі. Але і там пустэча.

Мы вярнуліся з пустымі рукамі. Хоць — не! На месцы мы зразумелі, што не трэба было ехаць далёка. Чаму? Найбольшая група дзяцей у Нараўчанскай гміне была на Сустрэчах „Зоркі".

*„Пружына"* — **Магдалена Панасюк, II клас Белгімназіі ў Гайнаўцы**

## Пружына

**Лукаш на пружыне стаяў**
**І моцна яе гайдаў**
**Дапераду, назад, направа -**
**Добра была забава.**
**Тым часам прыйшла Уля**
**Так на яго *задула*...,**
**Так на яго гукнула...,**
**Што Лукаш з арэляў зваліўся.**
**На шчасце, нямоцна пабіўся.**
**Слёз, праўда, было мала,**
**Бо Уля больш перажывала.**
**Ці Лукаш будзе на Улю крычаць?**
**Ці будзе ўвогуле штосьці казаць?**
**З Лукаша хлапчына храбры,**
**Вясёлы і вельмі добры.**
**На Улю ён не злаваў,**
**Толькі ўзяў і яе ...**
**Пацалаваў!**

*„Пружына"*,
**Магдалена Панасюк,**
**II клас Белгімназіі ў Гайнаўцы.**

# Віктар Швед у Гайнаўскім белліцэі

Спадар Віктар Швед завітаў да нас 2 чэрвеня. Сустрэўся ён з двума гуманітарнымі класамі — першым і другім. У I класе паэт многа расказваў аб сваім вельмі цікавым жыцці. У старэйшым класе паэт больш часу прысвяціў прэзентацыі сваёй творчасці.

Вучні даведаліся, што нестар беларускай паэзіі нарадзіўся ў вёсцы Мора на Гайнаўшчыне, закончыў пачатковую школу ў Орлі і Бельскі белліцэй. Затым пераехаў у Варшаву, дзе закончыў тры факультэты на ВНУ. Жыццё ў сталіцы «ўцягнула» яго аж на 40 гадоў, але, як ён сам сказаў, заўсёды сэрцам і душою быў звязаны з Беласточчынай.

Першыя паэтычныя спробы Віктара Шведа адбыліся яшчэ ў пачатковай школе на польскай мове. Па-беларуску дэбютаваў ён на старонках «Нівы» ў 1957 годзе вершам «Я беларус». Амаль 30 гадоў перапрацаваў рэдактарам варшаўскага выдавецтва «Ксёнжка і ведза». З'яўляецца вельмі плённым аўтарам. Дагэтуль выдаў ажно 15 паэтычных зборнікаў на беларускай і польскай мовах. Ён таксама сааўтар падручнікаў па беларускай мове, займаецца перакладчыцкай дзейнасцю. Спадар Віктар Швед з'яўляецца сузаснавальнікам літаб'яднання «Белавежа», членам Саюза польскіх пісьменнікаў. Да нядаўняга часу меў ён сваю рубрыку ў «Ніве» («Вершы Віктара Шведа»), у якой апублікаваў каля 2500 вершаў, пераважна для дзяцей, але не толькі. Кампазітары напісалі музыку да некалькіх дзесяткаў песень на яго словы.

Усе белліцэісты знаходзіліся пад вялікім уражаннем такога багатага творчага плёну паэта, які пасля адыходу на пенсію вярнуўся на сваю дарагую Беласточчыну, дзе жыве разам з жонкай і дачкой.

Спадар Швед чытаў нам вершы аб тым, калі ён быў студэнтам у Варшаве і сумаваў па роднай хаце, а таксама такія, якія паказваюць на ўсялякія праявы беларускага жыцця ў Польшчы, маюць пазнавальнае, хранікальнае, дакументальнае і рэфлексіўнае значэнні.

На канец сустрэчы мы ўручылі падарунак і павіншавалі паэта з 85-гадовым юбілеем. Частка вучняў падышла да аўтара, каб набыць яго кніжкі.

Гэтае спатканне з майстрам беларускай паэзіі ў Польшчы нам вельмі падабалася.

**Паўліна ЛАПІНСКАЯ**
**Гайнаўскі белліцэй**

# Лад пушчанскіх хат

*Цікаўнасць: - Чаму дамы ў вёсках у наваколлі Белавежскай пушчы пабудаваныя быццам пад лінейку, а тыя, што ў самой пушчы, быццам раскінутыя на палянах?*

**Ева Мароз-Кечынская**: — Даўным-даўно людзі будавалі як ім падыходзіла. За часоў каралевы Боны насельніцтва было ўпарадкаванае. Каб ведаць колькі грошай можна выцягнуць ад падданых, каралева рашыла, што палі, лугі і вёскі будуць размешчаны ў адпаведным парадку. Калі ўваходзім у вёскі, маем прамавугольныя і вузкія ўчасткі. Таму дом ставяць франтонам да вуліцы, значыць вузейшым бокам. Пасля стагоддзяў, калі людзі адбудоўваліся, яны трымаліся

старога архаічнага ладу прасторы.

— *Вандруючы па Падляшшы, можам пабачыць крыжы ў канцы вёсак. Дзеля чаго іх ставілі?*

— Часта ў такі спосаб абазначалі небяспечныя месцы: скрыжаванні, пачатак вёскі. Яны мелі за задачу ахоўваць таксама ад няшчасця, напрыклад, ад пажару.

— *Што абазначаюць узоры на ручніках? Што на іх можна прачытаць?*

— Я думаю, што можна прачытаць ці гэты чалавек, які вышываў ручнік, меў спрытныя рукі!

— *А ці аздобы на хатах звязаныя з нашай традыцыяй?*

— Усякія арнаменты і аздобы паяўляюцца пасля 1920 года, калі людзі вярталіся з бежанства. Людзі пабачылі ў Расіі нешта новае. Відавочна ім гэта падабалася і таму ўключылі аздобы ў сваю культуру. Але калі адказаць на пытанне, то гэтыя арнаменты не нашая традыцыя!

*„Цікаўнасць": запісала* ***Міхаліна Герасімюк****, II клас Белгімназіі ў Гайнаўцы*

# Віктарына аб футболе

**1. Што абазначае слова „corner"?**
а) аўтавая падача,
б) вуглавая падача,
в) пенальці.

**2. З колькі метраў б'юць пенальці?**
а) 11,
б) 12,
в) 13.

**3. Дзе адбыўся чэмпіянат свету па футболе ў 2010 г.?**
а) Кітаі,
б) Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы,
в) Польшчы і Украіне

**4. Колькі асоб у футбольнай камандзе?**
а) 10,
б) 11,
в) 12.

**5. Адкуль родам Дзідзьер Дрогба:**
а) з Камеруна,
б) з Нігерыі,
в) з Берага Слановай Косці

**6. У якой камандзе іграе бразілец Ранальдзінью?**
а) АК Мілан,
б) Інтэр Мілан,
в) ФК Барселона.

**7. Хто пераможца мундыяля ў 2006 г.?**
а) Італія,
б) Бразілія,
в) Іспанія.

***„Пружына"*, Пятро Аўксянцюк, I клас Белгімназіі ў Гайнаўцы**

# Польска-беларуская крыжаванка № 29

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 25:

Марк, загадка, ар, лапы, смага, канікулы, калідор, гук, на, голка. Зала, Ян, дар, сказ, малы, дранікі, гід, малако, Урал, рап, крышынка.



# Ад Бельска да Дуброўны. Летапіс 1377-1410

Алег ЛАТЫШОНАК

*Крыжацкае пытанне стала перад нашымі продкамі разам з заваяваннем Тэўтонскім ордэнам Прусіі і знішчэннем Яцвягіі ў выніку супольнай польска-руска-крыжацкай акцыі. У спрэчкі паміж пераможнымі бакамі за падзел яцвяжскіх зямель неўзабаве ўключылася Літва. Канчаткова літоўцы занялі не толькі значную частку Яцвягіі, але таксама ў палове XIII ст. Берасце, Камянец, Драгічын, Мельнік і Бельск, якія атрымаў Кейстут. З гэтай пары крыжаносцы мелі выдуманую прычыну для рабаўніцкіх „рэйзаў" (паходаў) на землі, якія, на іх думку, былі заселены „паганцамі" (літоўцамі) і „схізматыкамі" (так празывалі праваслаўных русінаў).*

Пасля смерці вялікага князя літоўскага Альгерда ў маі 1377 г. крыжаносцы ўзмоцнілі наступ на Кейстутавы ўдзел, намагаючыся знішчыць свайго найбольшага ворага і аказаць націск на новага вялікага князя — Ягайлу. На гэтым найбольш пацярпелі землі над Нарвай і Бугам. Крыжаносцы пад камандаваннем комтура Балгі Тэадорыка фон Эльнера захапілі і спалілі Бельск, але не здолелі заваяваць замка, у якім скрыліся абаронцы. Канчаткова штурм быў спынены, паколькі выпушчаная бельскім абаронцам страла папала ў твар англійскага каралевіча Рычарда (неўзабаве караля Рычарда II), які ўдзельнічаў у крыжовым паходзе супраць „паганцаў і схізматыкаў".

У жніўні 1379 г. Эльнер падышоў ад захаду пад Бярэсце, знішчыў і абрабаваў горад, але не здолеў заваяваць замка. Крыжаносцы абрабавалі таксама Камянец, а пасля накіраваліся на Бельск, Мельнік і Драгічын, але заваяваць гэтыя гарады ім не ўдалося. Пасля кароткага перапынку, восенню гэтага ж года, крыжаносцы спустошылі наваколле Бельска і спрабавалі заваяваць замак у Берасці, але і гэтым разам пацярпелі паражэнне, у выніку чаго цераз Гародню вярнуліся ў Прусію.

У 1382 г. літоўцам удалося заключыць мір з Тэўтонскім ордэнам, але ў змаганне за Падляшша ўключыўся мазавецкі князь Януш I. Сілай заняў ён Драгічын, разбураючы замак, заваяваў Мельнік, а ў Берасці аблажыў жонку Кейстута, Біруту, і захапіў горад. Першапачаткова Ягайла прабаваў вярнуць сабе Драгічын, але, паспрачаўшыся з сынам і наследнікам Кейстута, Вітаўтам, які ўцёк да крыжакоў, прымірыўся з існуючым станам рэчаў і надаў гэтыя землі Янушу I. Драгічын і Мельнік яшчэ некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі, але ўрэшце, найпазней у 1405 г., апынуліся пад панаваннем паміранага з Ягайлам Вітаўта.

Януш I валодаў землямі ўсходняга Мазоўша, але Візская зямля перайшла ва ўладанне ягонага брата Семавіта IV. У 1381 г. ён аддаў Візскую зямлю ў залог Тэўтонскаму ордэну. У 1392 г. крыжаносцы ўзвялі маленькі замак Метэнбург над Нетай, але яшчэ ў гэтым жа годзе разбурыла яго літоўскае войска, паколькі Вітаўт паспеў пасварыцца з Ордэнам. У гэтым жа годзе вялікі маршал Энгельхард Рабе ўзяў рэванш і пайшоў у атаку на Сураж разам са шматлікімі гасцямі з Заходняй Еўропы. Абаронцы Суража выйшлі перад валы і пачалі змагацца ў адкрытым полі. З прычыны перавагі захопнікаў загінула шмат літоўцаў і русінаў, а астатнія абаронцы здаліся. Самаахвярнасць абаронцаў не прапала дарэмна, бо ў гэтым жа часе з горада паспеў уцячы мазавецкі князь Генрык, швагер Вітаўта. Канчаткова крыжаносцы аддалі Вітаўту Райгорад, землі над Нетай і Гонязь, а астатняя частка Візскай зямлі вярнулася да Мазоўша.

Калі ў 1409 г. успыхнула Вялікая вайна з Тэўтонскім ордэнам, войска Вітаўта пачало з тэрыторыі Візскай зямлі і ад верхняй Нарвы абмежаваныя дзеянні ў напрамку Прусіі. Далейшыя ваенныя дзеянні спыніла перамір'е, якое мела доўжыцца да канца чэрвеня 1410 года.

Планы кампаніі на 1410 год былі распрацаваны на сакрэтнай нарадзе Ягайлы і Вітаўта ў Берасці над Бугам. Валадары сустрэліся тут 30 лістапада 1409 г. і абмяркоўвалі справу каля дзесяці дзён. Устаноўлена дату і месца канцэнтрацыі польскіх і літоўска-рускіх войскаў пад Чэрвінскам і напрамак наступлення — на Мальбарк, сталіцу Тэўтонскага ордэна.

Паміж 6 і 14 снежня 1409 г. Ягайла і Вітаўт у Белавежскй пушчы над ракою Лясной сарганізавалі паляванне з мэтай назапасіць мяса для войска на будучую вайну. Мяса салілі, вэндзілі і вясной 1410 года ў бочках сплаўлялі па Нараўцы, Нарве, Бугу, Вісле ў Плоцк, які быў вызначаны на базу для забеспячэння войска. Лавілі таксама дзікіх коней — тарпанаў — на патрэбы літоўскага войска.

Вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген не быў упэўнены ці польскія і літоўскія войскі будуць дзейнічаць супольна. Прабаваў ён запалохаць Вялікае Княства Літоўскае магчымасцю крыжацкага наступлення. У сакавіку-красавіку 1410 г. крыжаносцы пад камандаваннем вялікага маршала Фрыдрыха фон Валенрода зрабілі дзёрзкі наступ у бок Берасця. У Берасці прабываў Вітаўт, які адтуль даў загад, каб усе землі Вялікага Княства Літоўскага рыхтаваліся да паходу супраць Тэўтонскага ордэна. Вялікі князь сустрэўся тут з мазавецкімі і літоўскімі князямі, з якімі пэўна ўзгадніў планаванае перамяшчэнне літоўскіх і мазавецкіх войскаў аж да канцэнтрацыі ў Чэрвінску. Мабыць, крыжаносцы мелі намер выкрасці Вітаўта, які з Берасця падаўся ў Слонім, а на вестку аб крыжацкім наездзе неадкладна схаваўся ў лясах каля Здзітава і чакаў там да тае пары, калі непрыяцель адышоў назад. У Вербніцу, 14 сакавіка, Валенрод захапіў Ваўкавыск, спаліў горад і знішчыў шмат народу сабранага ў царкве на набажэнстве. Па дарозе знішчыў таксама край. Несумненна, ад гэтага крыжацкага паходу пацярпела Падляшша.

Літоўска-рускім войскам трэба было сабрацца раней, чым польскім, беручы пад увагу адлегласць, якая аддзяляла іх ад Чэрвінска. Войскі з Літвы і Жамойціі выйшлі з Вільні 3 чэрвеня; праўдападобна правым берагам Нёмана першапачаткова накіраваліся на поўдзень, а пасля перайшлі Нёман пад Гародняй, або яшчэ вышэй, і павярнулі на захад, выйшаўшы з лясоў толькі над Нарвай, на яе левым беразе. Праўдападобна тут аб'ядналіся з рускімі войскамі і татарскімі падмацаваннямі пад камандаваннем ханавага сына Джэлал-ад-Дзіна, якія прыбылі сюды раней. Армія Вітаўта з'явілася над Нарвай пару дзён да 14 чэрвеня. Гэтая рака разам з Бобрай і раскінутымі навокал прырэчнымі балотамі выконвалі ахоўную ролю, абараняючы ад неспадзяваных набегаў крыжаносцаў. Пасля некалькіх дзён адпачынку і пасля далучэння атрадаў з усходніх частак Вялікага Княства, руска-літоўскія войскі рушылі левым берагам Нарвы на захад. Паміж 24 і 28 чэрвеня мусілі перайсці раку Нарву ў яе ніжнім цячэнні пад аховай польскіх харугваў. У Чэрвінск, распаложаны на правым беразе Віслы, дайшлі яны да 30 чэрвеня. Ягайла разам з большай часткай польскіх войскаў пераправіўся праз Віслу цераз пантонны мост менавіта ў гэты дзень.

Польскую армію састаўлялі 50 харугваў. Вітаўт прывёў з сабой 40 рускіх і літоўскіх, а таксама татарскіх харугваў. Рыцарства з сённяшніх зямель Падляшскага ваяводства служыла ў наступных харугвах: Драгічынскай і Мельніцкай, а таксама Берасцейскай, Гарадзенскай і Троцкай. Усе гэтыя харугвы ад паасобных зямель выступалі пад знакам Пагоні.

З ліпеня пачаўся паход у напрамку крыжацкай мяжы. 13 ліпеня заваявана была ўмацаваная крэпасць Дуброўна. Менавіта ў беларускай традыцыі назва гэтага горада дала імя бітве, якую палякі называюць бітвай пад Грунвальдам. Вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген рушыў насустрач саюзных сілаў і перакрыў ім дарогу на Мальбарк — сталіцу Тэўтонскага ордэна — пад вёскай Грунвальд.

На адным баку апынулася больш за трыццаць тысяч рыцараў і жаўнераў з Польшчы, Літвы і Русі, а на другім — больш за дваццаць тысяч рыцараў і салдат з Прусіі, якім аказвала дапамогу шматлікае заходнееўрапейскае рыцарства. Левы фланг саюзных сілаў занялі польскія харугвы, а на правым апынуліся харугвы літоўска-руска-татарскія. Усімі саюзнымі сіламі камандаваў кароль Уладзіслаў-Ягайла. Першымі ў бой з крыжакамі ўступілі рыцары Вітаўта. Лепш узброеныя крыжаносцы пасля гадзіны бою сталі перамагаць і амаль увесь правы фланг кінуўся наўцёкі. Праўдападобна гэта быў запланаваны манеўр, запазычаны ў татарскага ваеннага майстэрства, хаця выкананы зусім недасканала. На полі бою засталіся тры беларускія харугвы: Смаленская, Мсціслаўская і Аршанская пад камандаваннем каралеўскага брата Сямёна-Лугвена, якія, нягледзячы на вялікія страты, прабіліся да палякаў. У тым часе ядро польскіх войскаў упарта змагалася з галоўнымі сіламі Тэўтонскага ордэна. Хаця ў пэўны момант упаў каралеўскі харужы са сцягам, аднак перамога пачала схіляцца на польскі бок. Юнгінген спрабаваў яшчэ павярнуць ход бітвы, кідаючы на поле бою рэзерв з 16 харугваў, але гэты манеўр аказаўся спозненым і яго харугвы папалі ў акружэнне. У дадатак на поле бою вярнуліся літоўскія атрады. Вялікі магістр загінуў, а разам з ім — цвет тэўтонскага рыцарства.

Саюзнікі не здолелі поўнасцю выкарыстаць перамогі, паколькі ордэнская дзяржава праявіла незвычайную ўстойлівасць. Аблога Мальбарка завяршылася няўдачай. Аднак перамога пад Дуброўнай (Грунвальдам) стала векапомным подзвігам беларусаў, палякаў і літоўцаў.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

# Круглы стол „Нівы” (2)

Неаднаразова словы трывогі з прычыны сітуацыі нацыянальных меншасцей, асабліва польскай у Беларусі, выказваў Еўрапарламент і Еўрапейская Камісія. Аднак сітуацыя меншасцей у гэтай краіне нязменная, надалей не могуць яны поўнасцю карыстацца правамі належнымі няўрадавым арганізацыям у поўнасцю дэмакратычных дзяржавах, а беларуская меншасць за мяжой не можа разлічваць на сур’ёзную падтрымку ўлад у Мінску. Кандыдатам у кандыдаты ў прэзідэнты Беларусі ды апазіцыянерам, якія ўключыліся ў вылучэнне такога кандыдата і якія прабывалі ў Беластоку, паставілі мы тры пытанні, між іншым такое:

— **Як беларуская дзяржава павінна адносіцца да беларускай меншасці за мяжой і меншасцей у Беларусі, сярод іх асабліва польскай?**

**Уладзімір Колас**, Рада беларускай інтэлігенцыі:

— Безумоўна, як любая цывілізаваная еўрапейская краіна, мы павінны шанаваць і падтрымліваць беларускую дыяспару ў іншых краінах свету, з самых розных бакоў. Перш за ўсё гэта салідарнасць да нашых сабратаў-беларусаў. Па-другое — гэта таксама наша ўзбагачэнне. Я памятаю па сваім, асабістым досведзе, што Беларускі гуманітарны ліцэй, якім я кірую, стварыўся пад уражаннем таго, што я пабачыў на Беласточчыне, калі я трапіў сюды на пачатку васьмідзесятых гадоў, калі я наведаў беларускія ліцэі ў Гайнаўцы і Бельску. Я быў настолькі моцна ўражаны тым, што тут захавалася, як польская дзяржава падтрымлівае і шануе беларускую тоеснасць, што мне стала сорамна што ў Беларусі ўсё гэта знішчана і нішчыцца. І менавіта дзякуючы, між іншым, гэтаму стварыўся Беларускі гуманітарны ліцэй і яго філіі. Рэформа, якая пачалася ў галіне адукацыі беларускай школы, беларусізацыі, пачалася з выкарыстання польскага досведу. Тое, што адбываецца зараз з Саюзам палякаў, з грубым умяшальніцтвам дзяржавы ў справы польскай меншасці, гэта таксама паказвае ўзровень перш за ўсё цывілізаванасці і дзяржавы, і народа, якія давялі да такога стану абыякавасці, апатыі, нежадання ўмешвацца ў ніякія, так сказаць, рашэнні дзяржавы. Беларускі народ ставіцца да польскай меншасці з вялікай павагай, беларускі народ традыцыйна талерантны. Тое, што адбываецца — ненармальнае, і калі зменіцца сістэма ўлады, тады, безумоўна, стане ўсё на сваё месца.

**Лявон Баршчэўскі**, былы старшыня Беларускага народнага фронту:

— Я прадстаўляю Беларускі народны фронт, які ад самага пачатку ўключаў у свае праграмы пытанне аб беларусах за мяжой, у тым ліку і Беласточчыны. Заўсёды я раіўся меншасцей. Яшчэ ўзгадваю палітычныя нарады ў Белавежы ў 1989 і 1990 гадах. Інтарэсы беларускай меншасці за мяжой — для нас прыярытэтнае пытанне.

**Мікалай Статкевіч**, старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі Народная Грамада, каардынатар Еўрапейскай кааліцыі:

— Абавязак любой дзяржавы — падтрымліваць сваіх суайчыннікаў за мяжою, спрыяць захаванню іх культуры, падтрымліваць іх матэрыяльна, каб як мага далей яны і іх патомкі захоўвалі сваю нацыянальную ідэнтычнасць. Гэта, акрамя ўсяго іншага, дае вялікія магчымасці для дзяржавы, добрасумленныя грамадзяне якой маюць памкненні да радзімы бацькоў, ладзіць пры іх дапамозе двухбаковыя стасункі ў найлепшай ступені. Беларуская сучасная дзяржава не надае гэтаму належнай увагі.

**Сяргей Калякін**, старшыня Беларускай партыі левых „Справядлівы свет”:

— Калі будзем гаварыць пра беларусаў, якія пражываюць па-за межамі Беларусі, дык, безумоўна, дзяржава павінна клапаціцца за іх і падтрымліваць, ствараць умовы для таго, каб яны захавалі сваю ідэнтычнасць, каб маглі захаваць сваю культуру і мову. Дзяржава павінна праз пасольствы ў краінах, дзе пражываюць нашы землякі, арганізоўваць іх і аказваць усялякую падтрымку згуртаванням ды вырашаць праблемы, з якімі яны хочуць справіцца. Дзяржава не павінна праводзіць дыскрымінацыйнай палітыкі ў адносінах да меншасцей. Мы павінны інтэграваць усе нацыянальныя меншасці, якія пражываюць у нашай краіне для таго, каб яны адчулі сябе паўнапраўнымі членамі беларускага грамадства. З другога боку — дзяржава не павінна перашкаджаць ім у іх жаданні і магчымасцях рэалізаваць уласную аўтэнтычнасць і разам з іншай краінай, скажам з Польшчай у выпадку Саюза палякаў, павінны памагаць ім вырашаць іх праблемы, у тым ліку захавання іх культуры, традыцыі, мовы. Гэтага, на жаль, у цяперашняй Беларусі не назіраем — ні сур’ёзнай падтрымкі беларусаў за мяжой, ні нармальнага садзейнічання з меншасцямі ў Беларусі.

**Анатоль Лябедзька**, старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі:

— Адносіны да беларускай меншасці за мяжой, як і да польскай меншасці ў Беларусі — абсалютна аднолькавыя. Калі ўлада аднолькава адносіцца да нацыянальных меншасцей унутры краіны, тады ў яе ёсць і маральнае, і палітычнае права патрабаваць, каб і да замежных беларусаў ставіцца аднолькава. Калі вось гэтага няма, калі ёсць розныя стандарты, тады вельмі складана. Важна цяпер гаварыць з афіцыйнай дзяржавай пра беларускую меншасць у Польшчы. Аднолькавы падыход стварае гарантыі для нашай беларускай меншасці ў іншых краінах.

**Рыгор Кастусёў**, Партыя Беларускага народнага фронту:

— Я магу параўнаць, як адносяцца іншыя краіны да сваіх меншасцей. Напрыклад, як адносіцца літоўскі ўрад да літоўцаў у Расіі. Адносіны ў параўнанні з нашай сітуацыяй гэта неба і зямля, таму што адносін беларускага ўрада да беларускай меншасці няма. Беларускую меншасць за мяжой беларускія ўлады проста забылі, яны можа і ведаюць, што яна існуе, але на яе ніякай увагі не звяртаюць. Чым гэта можна даказаць? Гэта адносіны і да беларускіх школак, да беларускай мовы, да развіцця беларускай культуры за мяжой. Як паказчык і доказ гэтаму, што ўлады не звяртаюць увагі на беларускую меншасць за мяжой гэта тое, што колькасць беларусаў за мяжой па афіцыйных даных змяншаецца. А калі гаворка пра польскую меншасць у Беларусі, то, на маю думку, усе жыхары Беларусі павінны мець роўныя правы, незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці. Асаблівасць польскай меншасці ў Беларусі тая, што гэтыя людзі не прыехалі жыць адкульсці, не прыехалі за мяжу сваёй краіны; яны тут у Беларусі нарадзіліся, выраслі, тут жылі іх продкі, і гэта зямля іх продкаў. Мы не павінны забываць, што ў іх існуе і павінна далей існаваць іх культура, іх мова, і беларускі ўрад павінен ім у гэтым накірунку аказваць падтрымку. У той жа ступені, як беларуская ўлада не павінна забываць пра беларускую меншасць у іншых краінах, як у Польшчы, Расіі, так не павінна забываць пра польскую меншасць якая пражывае ў Беларусі.

**Алесь Міхалевіч**, незалежны кандыдат у прэзідэнты:

— Для мяне гэтае пытанне заўсёды істотнае. Я заўсёды падтрымліваў адносіны з лідарамі, з актывістамі беларускай меншасці ў Польшчы. Вельмі важна, каб дзяржава — так як адна, так і другая — гарантавала ўсе магчымасці для развіцця: каб былі школы, і перыядычныя выданні, і каб кожны чалавек, які хоча вызначыцца ў прыналежнасці да той ці іншай меншасці, меў такую магчымасць і не саромеўся гэта зрабіць. Для гэтага павінна быць адпаведная дзяржаўная падтрымка, у тым ліку, зразумела, дзяржаўная падтрымка з боку Рэспублікі Беларусь для беларускай меншасці ў Польшчы. Яна вельмі малая і павінна быць непамерна большая. Гэта і стварэнне беларускіх культурных цэнтраў, і стварэнне музеяў, гэта фіксацыя гэтай спадчыны, якая на сённяшні дзень яшчэ захавалася, але вельмі хутка яе можа не быць. Малыя вёскі вымираюць — гэты працэс вядомы не толькі на Беласточчыне, ён адбываецца таксама і ў сённяшняй Беларусі — і трэба гэтую спадчыну зафіксаваць, трэба паказаць, што ўсё гэта існуе. Што датычыць польскай меншасці ў Беларусі — я маю асабіста вельмі добрыя адносіны з лідарамі незарэгістраванага Саюза палякаў. У маёй праграме будзе асобны раздзел, асобная ўлётка для польскай меншасці ў Беларусі, якая гаворыць і пра адкрыццё польскіх школ, пра гарантаванне выхаду часткі дзяржаўных газет у раёнах з большасцю ці пераважнай большасцю польскага насельніцтва на польскай мове. Я кажу пра магчымасці адкрыцця ў Гродне польскага ўніверсітэта. Я выступаю за тое, каб польская меншасць мела ў Беларусі ўсе магчымасці для свайго раўнапраўнага развіцця. Немагчыма выступаць за гарантаванне правоў беларускай меншасці ў Польшчы і пры гэтым казаць, што польская меншасць у Беларусі не павінна мець гэтых правоў. Гэта натуральныя правы гэтых людзей. І саме галоўнае — трэба памятаць пра тое, што, гэта не тыя палякі, што прыехалі з Польшчы ў Беларусь ці тыя беларусы, што прыехалі з Беларусі ў Польшчу. Гэта тыя людзі, што жывуць на сваіх землях спрадвеку і для каго гэтая вёска, гэты горад, гэтая зямля з’яўляюцца сваёй. Я ўпэўнены ў тым, што беластоцкія беларусы з’яўляюцца лаяльнымі грамадзянамі незалежнай Польшчы, настолькі ж упэўнены ў тым, што палякі ў Беларусі могуць быць не проста лаяльнымі грамадзянамі незалежнай Беларусі, не проста выступаць за незалежнасць Беларусі, але яны могуць быць вельмі важнымі людзьмі, якія дапамогуць сфармаваць і напоўніць сапраўдным зместам сённяшнюю беларускую незалежнасць.

*(заканчэнне ў наступным нумары)*

Фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

# Непажаданы (зноўку!)



*У суботу яшчэ разам на Рынку Касцюшкі злева Ігар Чарняўскі з Міністэрства культуры РБ, справа Роберт Тышкевіч з пасланнем ад Міністра культуры РП*

Калі ў нядзелю 11 ліпеня ў Музеі вёскі ў падбеластоцкіх Асовічах працягваліся змаганні ў рамках імпрэзы „Канцэнтрацыя войск Вялікага Княства Літоўскага. Грунвальд 1410-2010", маючай — як казаў прадстаўнік мінскага міністэрства культуры — спалучаць польскі, беларускі і літоўскі народы, падляшскі дэпутат ГП Роберт Тышкевіч пад помнікам ксяндзу Ежы Папялушку ў Беластоку склікаў у неадкладным парадку прэс-канферэнцыю. Яму быў адмоўлены ўезд у Беларусь. Ехаў ён з афіцыйнай парламенцкай дэлегацыяй у таварыстве польскай віцэ-консул у Гродне на консульскай аўтамашыне. Разам з ім падаваліся з візітам тры дэпутаты ад ПіС. У Беларусь уехалі яны без перашкод. Дэпутат Тышкевіч, намеснік старшыні сеймавай камісіі замежных спраў і шэф Парламенцкай групы па справах Беларусі, як і апошняя частка дэлегацыі, меў прыняць удзел ва ўрачыстасцях прымеркаваных да 66 гадавіны Акцыі „Вострая Брама" на Гродзеншчыне, прыгадваючых як 7 ліпеня 1944 года атрады Арміі Краёвай спрабавалі самастойна вызваліць Вільню з рук немцаў. Планаваў ён удзельнічаць у імшы ў Солах ды прыпаднесці кветкі загінуўшым салдатам у шасці мясцовасцях, а таксама сустрэцца з ветэранамі. Урачыстасці супольна сарганізавалі Генеральнае консульства РП у Гродне ды непрызнаваны беларускімі ўладамі Саюз палякаў у Беларусі. Дэпутат Тышкевіч атрымаў адмову ўезду каля гадзіны 7.40. Незалежна ад інтэрвенцыі ў Мінску ў беларускім МЗС польскіх консулаў і часова паверанага польскага пасольства, праз сорак хвілін памежная ахвова на пагранпераходзе ў Кузніцы-Беластоцкай падтрымала сваё рашэнне.

— Партыйная прыналежнасць не мела тут значэння. Я рады, што калегі з ПіС уехалі ў Беларусь, — сказаў дэтутат ад ГП журналістам яшчэ да пачатку канферэнцыі.

Пасля, ужо поўнасцю афіцыйна:

— Мне быў адмоўлены ўезд рашэннем памежных служб, але, як дадумваюся, было гэта палітычнае рашэнне Мінска. Паінфармавалі мяне толькі, што ў адпаведнасці з Жэнеўскай канвенцыяй я з'яўляюся асобай, якой нельга ўехаць на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь. Беларускі бок не выказаў прычын свайго рашэння. Здаецца, была яна спрычынена маёй ангажаванасцю ў змаганне за дэмакратыю, падтрымліваннем дэмакратычных устаноў у Беларусі і свабодных СМІ вяшчаючых на Беларусь ды розных праграм па захоўванні правоў чалавека і грамадзяніна. Не без прычыны застаецца факт, што я з'яўляюся старшынёй Парламенцкай групы па справах Беларусі, якой галоўным заданнем, пастаўленым ёй Сеймам, з'яўляецца падтрымліванне дэмакратыі якраз у Беларусі і пабудова там адкрытага грамадства, каб Беларусь магла набліжацца да Еўропы. Важным у тым кантэксце з'яўляецца таксама мая ангажаванасць у падтрымку непрызнаванага СПБ у яго памкненнях да легальнай дзейнасці і факт, што я з'яўляюся адным з трох мужоў даверу СПБ і падтрымліваю такім чынам гэты саюз м.інш. у дзеяннях у адносінах да польскіх улад.

Адзначыў:

— Падзея, у якой я хацеў прыняць удзел, звязана была выключна з патрыятычнымі, гістарычнымі ўрачыстасцямі, якія не мелі ніякага палітычнага кантэксту. Гэта была тыпова польская ўрачыстасць. Пры адстаўцы Анжалікі Борыс з функцыі старшыні СПБ, беларускія ўлады намерваюцца абвастрыць рэпрэсіі ў адносінах да гэтага саюза. Мы ехалі таксама дзеля таго, каб гэтыя ўрачыстасці маглі адбыцца бяспечна і польская меншасць магла адчуць падтрымку польскага парламента.

„Ніва" папрасіла Роберта Тышкевіча, у кантэксце адмовы яму ўзеду ў Беларусь, даць каментарый наконт выказвання прэс-сакратара МЗС у Мінску пару дзён таму аб тым, што быццам пасля выбару на прэзідэнта РП Браніслава Камароўскага меў наступіць новы, больш цёплы этап польска-беларускіх адносін. Дэпутат адказаў:

— Гэта абазначае як трэба ўспрымаць заявы беларускіх улад. Яны не маюць ніякага дачынення да рэальнасці. У чарговы раз маем дачыненне з сітуацыяй, калі беларускія ўлады шмат дэкларуюць, многа прадбачваюць, а няшмат робяць. Гэты інцыдэнт паказвае, што маем дачыненне не толькі да спынення працэсу дэмакратызацыі ў Беларусі, а нават з рэгрэсам. Ад даўжэйшага часу не было такіх інцыдэнтаў. Шкодзіць ён іміджу Беларусі і паказвае яе фактычныя інтэнцыі таксама ў адносінах з Еўрасаюзам. Напэўна будзе ён мець значэнне пры ацэнцы дзеянняў Беларусі ў час асенняга вырашання таго ці адмяніць санкцыі ў адносінах да гэтай дзяржавы, ці іх працягнуць.

Пыталіся мы ў намесніка старшыні сеймавай камісіі замежных спраў ці спадзяецца з боку польскага МЗС афіцыйнай, пратэстацыйнай дыпламатычнай ноты ў справе гэтага здарэння:

— Гэта патрабуе разважнага абмеркавання польскім МЗС. Гэтага нельга пакінуць без рэакцыі. Кожны такога тыпу выпадак павінен сустрэцца з вельмі вострай рэакцыяй з польскага боку і патрабаваннем поўнага яго высьятлення. Спадзяюся, што мяне перапросяць або МЗС будуць пададзены ноты або прыняты іншыя адпаведныя рашэнні.

Што цікава, больш-менш год таму дэпутат Роберт Тышкевіч уехаў у Беларусь без праблем, падаючыся на з'езд „нелегальнага" СПБ (іншым разам таксама не быў упушчаны, але пры чарговых афіцыйных падарожжах дазвалялі яму на ўезд). Тлумачыў:

— Так бывае з таталітарнымі дзяржавамі, што рознага тыпу інцыдэнты могуць здарацца нечакана і ў любы момант, як гэты.

Яшчэ 11 ліпеня прэс-сакратар польскага ўрада Павел Грась прадбачыў інтэрвенцыю прадстаўнікоў урада ў гэтай справе.

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

Усяго прадугледзець у жыцці немагчыма. Ці мог падумаць у далёкія ўжо 1990-я гады Аляксандр Лукашэнка, калі штодня братаўся з расійскім кіраўніцтвам і распраўляўся з беларускай апазіцыяй, што гэтыя братанні і расправы нейкім дзівосным чынам аб'яднаюцца і разам пачнуць вылазіць бокам? Яскравым прыкладам гэтаму сталі чарговыя беларуска-расійскія братэрска-эканамічныя свары. У выніку расійскія тэлеканалы, якія так ці інакш кіруюцца з Крамля, узгадалі пра тых, чыё знікненне, мякка кажучы, не вельмі расчаравала беларускага „апошняга дыктатара". Пытанне, чаму дагэтуль яны не краналі гэтую тэму, — засталося па-за кадрам. Але яно цягам доўгіх гадоў не дае спакойна жыць родным і блізкім зніклых беларускіх палітыкаў, а таксама жонцы і сыну тэлеаператара Зміцера Завадскага, пра якога нічога невядома з ліпеня 2000 года.

Зразумець іх боль і пачуцці ў нечым дапамагае сайт у інтэрнэце, што месціцца па адрасе **http://zavadsky.org**. Ён належыць фундацыі, якая носіць імя Зміцера.

Калі пільна прыглядзецца да цэлага выяўлення, то ўзнікае нейкае жалобнае пачуццё, бо разумееш, што дадзены сайт з'явіўся толькі „дзякуючы" бядзе. Бядзе, якая ў сучаснай Беларусі можа прыйсці ў дом кожнага, хто ў нечым не згаджаецца з палітыкай цяперашняга рэжыму.

На сайце пераважае чорны колер. Уверсе — адлік часу з моманту знікнення тэлеаператара, які калісьці папросту пакінуў беларускае дзяржаўнае тэлебачанне, бо, як распавядае яго жонка Святлана, „не хацеў, каб людзі плявалі яму ў твар".

Сайт зроблены даволі проста. Выйсці да ягоных рубрык месцяцца ўверсе выяўлення, а ўсе старонкі, акрамя галоўнай, падзелены на дзве часткі.

На галоўнай жа размешчаны фотаздымак Завадскага з невялікім біяграфічным расповедам. Побач знаходзіцца стужка навін. З большага яны тычацца праваабарончай дзейнасці і палітыкі. Далей — здымкі і расповеды пра незалежных беларускіх журналістаў, якія былі знойдзены забітымі. Гэта Вераніка Чаркасава і Васіль Гроднікаў.

Паколькі сайт прысвечаны Зміцеру Завадскаму, адной з першых рубрык з'яўляецца „Фотаархіў". Там месцяцца здымкі з сямейнага альбома тэлеаператара, момантаў ягонай працы, фотарасповеды пра акцыі памяці зніклых.

Падобныя акцыі вельмі патрэбныя для тых, хто жыве ў Беларусі, бо многія не толькі не ведаюць, але і не хочуць ведаць праўды пра жудасныя падзеі, звязаныя са знікненнем людзей, у прыватнасці Зміцера Завадскага. Для тых, хто папросту не мае інфармацыі, дапаможа старонка „Гісторыя справы".

„Мы пастараліся сабраць тую сапраўды рэальную інфармацыю, якая была ў прэсе, і дапамагчы прадставіць аб'ектыўную карціну таго зьнікненьня", — пішуць аўтары сайта.

На старонцы „Артыкулы" неабыякавы карыстальнік знойдзе мноства публікацый на беларускай і рускай мовах, якія тычацца сённяшняй сітуацыі ў Беларусі, становішча з дэмакратыяй і правамі чалавека.

Пра Фундацыю імя Зміцера Завадскага распавядаецца на старонцы „Аб фундацыі": „Фундацыя імя Зьмітра Завадзкага гатовая супрацоўнічаць з усімі, хто хоча бачыць Беларусь незалежнай і дэмакратычнай краінай, дзе свабода слова — ня мара, а рэчаіснасьць паўсядзённага жыцьця". Сярод сябраў фундацыі як беларускія грамадзяне, так і прадстаўнікі іншых краін.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**

**Іспанскі гімн атакі**

Завяршылася вялікае футбольнае свята, што доўжылася цэлы месяц. Першынство, якое стала найбольш лагічным і справядлівым, прынамсі ў пасляваеннай гісторыі. Мундыяль, які падарыў планеце 8-ю нацыянальную каманду што стала чэмпіёнам. І няхай нікога не бянтэжаць чатыры матчы запар, якія зборная Іспаніі выйграла ў плэй-оф з аднолькавым лікам 1:0. Бо „чырвоная фурыя" ў кожнай з гэтых сустрэч пяяла гімн атакі, а сапернікі найперш не давалі ёй гуляць.

Другі чэмпіянат запар (4-ы раз у біяграфіі) бронзавыя медалі дасталіся нямецкай дружыне. Уругвайцы ў матчы за 3-е месца здабылі яшчэ больш сімпатыкаў, але выйграць у бундэстыма не змаглі. Селеста выставіла практычна аптымальны склад, ды сапраўды чорны дзень выдаўся ў яе брамніка Фернанда Муслеры: ні то яго бянтэжыў моцны дождж, ні то празмерны мандраж. Бундэстым жа зазнаў істотную кадравую ратацыю. Нямецкі інтэрнацыянал выглядаў на гэты раз менш грозна, але матывацыі яму не бракавала. Neues Ordnung Яўхіма Лёва прынёс урэшце жаданы вынік. Падзеяў у сустрэчы было досыць багата. Пасля далёкага стрэлу новаспечанага капітана Басцяна Швайнштайгера на дабіванні інстынктыўна згуляў Томас Мюлер. Чаруа адказалі эфектнай атакай, якую завершыў Эдынсан Каваці — 1:1. У пачатку 2-га тайма чарговы голавы эцюд здзейсніў Дыега Фарлан. Але нардычны характар немцаў, разбаўлены паўднёвым тэмпераментам натуралізаваных легіянераў, прынёс свой пазітыўны вынік для „маншафт". Марсэль Янсэн і Самі Хедзіра галавой забілі па мячу ў сетку ўругвайцаў — 3:2. На апошніх секундах Фарлан са штрафнога праверыў на трываласць папярэчыну брамы саперніка. Кампенсацыяй для яго пазней стала прызнанне лепшым футбалістам мундыялю.

Фінальная бітва была азмрочана россыпам жоўтых картак. Брыгада арбітраў брытанскага паліцэйскага Ховарда Уэба ледзь змагла прыглушыць жарсці. Спецыфіка цяперашняй зборнай Нідэрландаў у тым, каб дабівацца максімальнага выніку з наборам не самых класных выканаўцаў. Гэта ўжо зусім не тыя аранжавыя рамантыкі папярэдніх пакаленняў, што цешылі вока эстэтаў выкшталцонасцю. У фінале галандцы павялі сапраўдную „карыду" на пірэнейцаў. Іспанскія матадоры, якія спавядаюць зусім іншы стыль, часам адказвалі апанентам узаемнасцю. Чэмпіёны Еўропы, аднак, яшчэ раз з годнасцю даказалі, што з'яўляюцца на сёння лепшай камандай свету. Іспанцы ўрэшце паламалі і жалезабетонную абарону „Оранье" і статыстычную традыцыю, згодна якой каманда, прайграўшая стартавы матч, ніколі дагэтуль не станавілася чэмпіёнам. Асноўнага часу, праўда, забракла. Галандцы таксама некалькі разоў былі блізкія да трыумфу. Асабліва іх выразны лідар Ар'ен Робэн, два выхады якога сам на сам з брамнікам цудам нейтралізаваў Ікер Касільяс. У астатнім аранжавым не ставала вынаходлівасці, а гульня „ў косць" урэшце прывяла да заканамернага выдалення Джона Хейтынгі. Іспанцы, „адчуўшы кроў" неўзабаве скарысталіся слабым месцам. На 117-й хвіліне Сеск Фабрэгас вывеў нястомнага энерджайзера Андрэса Ін'есту на карную пазіцыю і той сатварыў самы важны гол у сваім жыцці. Сустрэча выразна прадэманстравала наколькі кадравы патэнцыял іспанцаў быў вышэйшым за нідэрландскі. Асобамі ж матча назавем галкіпера Ікера Касільяса, без якога ўчора глядзела б у неба і плакала ўся Іспанія, а таксама Андрэса Ін'есту, які ў фінале прадэманстраваў гульню вышэйшага гатунку ва ўсіх кампанентах. Віва Іспанія! Заслужаная слава новаму чэмпіёну свету!

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

## Гайнаўскія пенсіянеры ў Мельніку

Віктар БУРА

Чарговае мерапрыемства Гайнаўскага аддзела Саюза пенсіянераў і інвалідаў адбылося ў аўторак, 29 чэрвеня. А гадзіне 9-й з-пад магазіна „Бядронка" на шыкарным аўтобусе сорак гайнаўскіх пенсіянераў адправілася на экскурсію ў Мельнік. Вадзіцель аўтобуса Янка Грыгарук — вопытны шафёр, культурны і добразычлівы чалавек. За рулём працуе ён ужо 32 гады, з чаго апошнія 12 гадоў — за баранкай турыстычнага аўтобуса. Самы доўгі ягоны маршрут гэта Грэцыя. Вазіў ён турыстаў па ўсёй Польшчы, а таксама ў Балгарыю, Беларусь і Украіну. Каб падарожжа прайшло ў прыемнай атмасферы, уключыў ён касету з беларускімі песнямі.

У Мельніку сустрэў нас Юрка Снежка, які быў нам гідам па мястэчку і ваколіцы. Пабачылі мы помнікі архітэктуры, даведаліся пра культурна-асветнае жыццё гміны і дзейнасць Гміннага асяродка культуры, спорту і адпачынку. У яго распараджэнні знаходзяцца два спартыўня аб'екты: спартыўная зала з трыбунай на 200 чалавек і футбольная пляцоўка з трыбунамі на 260 крэсел, які складаюць фешэнебельную трэніровачную базу з усімі выгодамі (раздзявальні, лазні, душы, саўна). Наведваюць яе шматлікія футбольныя каманды, напрыклад, „Ягелонія" Беласток, „Легія" Варшава, „Нёман" Гродна, МТЗ-РІПА Мінск, „Белкард" Гродна, „Дарыда" Ждановічы. А штодзень прыгожымі спартыўнымі аб'ектымі карыстаецца мясцовая футбольная каманда МКС Мельнік, якая гуляе ў III лізе.

Праз Мельнік пралягаюць цікавыя ў прыродным плане турыстычня шляхі, а блізкасць мяжы ЕС з Беларуссю дае рэальны шанс на развіццё эканомікі, перш за ўсё ў сферы абслугі транзітнага прыгранічнага руху і харчовай вытворчасці. Пабачылі мы Шлях бункераў лініі Молатава, Шлях „Мельніцкі пералом Буга", Байдарачны шлях па Бугу. Любаваліся мы ўзгорыстым рэльефам гміны з узвышшамі ад 119 да 204 м над узроўнем мора, з лагчынамі ўтворанымі ледавіком. Стромкае ўзвышша, даліна Буга і крэйдавы кар'ер уплываюць на асобны, стэпавы мікраклімат мясцовасці з унікальнымі ксератэрмічнымі раслінамі.

Моцнае ўражанне пакінула на нас VI Выстава „Карункавая вытворчасць, гафт і іншае рукадзелле", на якой прэзентаваліся працы, інспіраваныя лакальнай традыцыяй і прыклады сучасных тэндэнцый у дэкаратыўным мастацтве. На выстаўцы дамінавалі гафт і карунка — асноўныя формы народнага мастацтва. Экспанаваліся таксама прыклады ткацтва, вырабы з саломы, вербалозу і мельніцкай крэйды.

Пасля з нашай групай сустрэліся дзеячы мясцовага пенсіянерскага гуртка „Рабіна". Яго старшыня Аліцыя Акачук (член СПіІ з 1992 г., а старшыня гуртка з 2005 г.) расказала пра дзейнасць гуртка мельніцкіх пенсіянераў. Старшыня Гайнаўскага аддзела СПіІ Мікалай Чыквін запрасіў мельніцкіх сяброў у Гайнаўку. Запрашэнне было прынята.

Ад імя ўдзельнікаў экскурсіі сардэчна дзякую старшыні гуртка ў Мельніку Аліцыі Акачук за сардэчны прыём, сустрэчу пры каве і гарбаце. Дзякуем таксама вадзіцелю аўтобуса Янку Грыгаруку за цудоўную атмасферу ў час падарожжа і жадаем яму многа шчасця і здароўя.

## Аб адной дарозе, але не толькі

М. Ц.

Многа езджу па дарогах і дарожках нашага рэгіёна, асабліва па лакальных, міжгмінных, якія спалучаюць паасобныя вёскі. І агульна можна сказаць, што іх стан добры. Не адна гравійка ці брукаванка больш роўная і няшкодная машыне, чым некаторыя асфальтавыя дарогі на Мазоўшы. І таму з гонарам гаварыў я пра дбайнасць аб дарогі ў нас у размовах з гасцямі з іншых бакоў Польшчы. Так было да апошняй нядзелі, калі прыйшлося мне пакарыстацца роўнай і бяспечнай — як мне памяталася — шашой з Сямятыч у Цехановец. Даўно я не ехаў па гэтай дарозе, але пасля таго, што я перажыў у апошнюю нядзелю, няхутка зноў збяруся ў падарожжа па гэтым маршруце.

Справа ў тым, што на адрэзку некалькіх кіламетраў, што ні крок стаяць знакі абмежавання скорасці да 50, 40, 30, а нават да 20 кіламетраў у гадзіну. І не раю нікому ігнараваць іх! Бо вось у меру гладкі асфальт раптам канчаецца і перад вамі з'яўляецца грунтавая раз'езджаная дарога поўная ям і калдобін, быццам будаўнічая пляцоўка, якую скалясілі магутныя самазвалы і бульдозеры. Каб не пашкодзіць машыны, такі адрэзак трэба пераадольваць вельмі павольна і ўважліва. Кашмар! А далей паўкіламетра-кіламетр нармальнай дарогі і зноў абмежаванне скорасці. І так увесь час, аж да млосці!

Ну што ж, пэўна не адна такая дрэнная дарога ў нашай краіне. Але я задумваюся, як можна было давесці да такога жахлівага стану раней добрую дарогу. І пэўна аб гэтам ведалі адказныя чыноўнікі. У абодвух старостствах — у Сямятычах і Высокім-Мазавецку — працуюць адпаведныя аддзелы, якія займаюцца дарожнымі справамі, узначальваюць іх адпаведныя кіраўнікі. За што тады ім плацяць? Зарплату павінны атрымліваць тыя, хто выконвае нейкую працу. А яны пэўна і прэміяльныя атрымліваюць! Ведаю, што дэмакратыя гэта такі лад, у якім ніхто за нішто не нясе адказнасці. Але можа ўжо надышла пара, каб з гэтым пакончыць? Калі б кіраўнікі трапілі ў турму за сабатаж і выманьванне дзяржаўных грошай (бралі ж зарплату!), то можа іх наступнікі хутка знайшлі б спосаб на рамонт дарогі, а ў іншых паветах не даходзіла б да такіх сітуацый. Але каб так было, вінаватых трэба прыцягнуць да адказнасці, але такое не прадугледжана ні ў нашай традыцыі, ні ў практыцы еўрасаюзных назіральнікаў за мясцовымі ўладамі. Давайце тады далей брысці ў немач дзеянняў, у адсутнасць здаровага розуму, у бяскарнае дапусканне да яўнай негаспадарнасці. Бо менавіта ў гэтам заключаецца кіруючая ў Польшчы палітычная сістэма.

А можа я памыляюся, га?

## Заўсёды з „Нівай"

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Людміла Савіцкая са Свінарояў (Нараўчанская гміна) пастаянна робіць квартальную падпіску на „Ніву". Спадарыня Людміла звязана з „Нівай" ад пачатку яе існавання. Найбольш цікавяць яе допісы перш-наперш пра падзеі і людзей з Нараўчанскай гміны, адным словам — са сваіх родных мясцін. Зараз яна пенсіянерка і мае ўдоваль свабоднага часу. Муж Людмілы, Грыша, памёр у пачатку гэтага года. Яна пражыла з ім 56 гадоў. Спадарыня Людміла працавала ў сталовай ГСу ў Нараўцы, а муж — на чыгунцы. Мелі яшчэ гаспадарку ў 5 гектараў.

Наш родны часопіс кожны чацвер прыносіць спадарыні Людміле лістаноша Юрка Дрозд.

— „Ніву" буду выпісваць да таго часу, пакуль буду жыць, — кажа Людміла Савіцкая. — Гэта ж наш родны часопіс. Ён заслугоўвае таго, каб сказаць, што адыгрывае вялікую ролю ў развіцці беларускай мовы. Ён гуртуе беларусаў і шмат робіць дзеля таго, каб мы мацней і глыбей адчувалі сваю тоеснасць.

5 ліпеня журналістка „Нівы" Міра Лукша падпісала Людміле Савіцкай свае кніжкі „Гісторыі з белага свету" і „Жывінкі з глыбінкі", а таксама папрасіла мяне перадаць ёй яшчэ адну — пад загалоўкам „Шчадруха" Алены Анішэўскай. Спадарыня Людміла сардэчна падзякавала за кнігі. Яна перадае ўсяму рэдакцыйнаму калектыву „Нівы" і чытачам самыя лепшыя пажаданні.

## Новы пераход

У горадзе Васількаве (Беластоцкі павет) ужо можна бяспечна прайсці цераз вуліцу Беластоцкую каля Гарадской управы. Тут закончылі пабудову святлафора. У гэтым месцы на галоўнай вуліцы ў горадзе здаралася шмат нешчаслівых выпадкаў з удзелам пешаходаў. Зараз дзякуючы святлафору жыхары Васількава пераходзяць вуліцу без страху. Трэба толькі прыціснуць гузічак і пачакаць да моманту, калі запаліцца зялёнае святло. У наступным годзе паставяць тут яшчэ адзін святлофор — за мостам праз раку Супрасль.

# Адгаданка



**Шыфраграма**

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Станіслава Леца.

1. кніга з Псалтыром = 35 _ 34 _ 36 _ 33 _ 32 _ 26 _;
2. наддунайскі горад на паўночным захадзе Балгарыі = 16 _ 15 _ 13 _ 14 _ 3 _ 27 _;
3. віленская рака = 19 _ 20 _ 21 _ 22 _ 18 _;
4. мангольская пустыня = 8 _ 7 _ 31 _ 9 _;
5. першы гук музычнай гамы = 38 _ 25 _;
6. трэці гук музычнай гамы = 46 _ 47 _;
7. тавар Заблоцкага = 2 _ 17 _ 6 _ 5 _;
8. швейцарскі кантон з Альтдорфам = 39 _ 29 _ 28 _;
9. музычны твор, заснаваны на паслядоўным паўтарэнні адной тэмы некалькімі галасамі; найвыдатнейшыя напісаў Й. С. Бах = 4 _ 37 _ 44 _ 45 _;
10. дзяржава з Сант'яга = 40 _ 41 _ 11 _ 10 _;
11. зімовае верхняе адзенне з футра = 23 _ 1 _ 42 _ 43 _;
12. між Невадай і Каларада = 12 _ 24 _ 30 _.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды. **(ш)**

**Адказ на адгаданку з 25 нумара**

Амфара, кнот, ангіна, трыёд, мільён, аркуш, сталь, ампір, выява, Лія, Іоў, сяўба, янтар, урад, лімон, свінар.

Рашэнне: **Многія трыумфальныя аркі станавіліся ярмом народу.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
***Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.***

**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

**Prenumerata krajowa**
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

**Prenumerata z wysyłką za granicę**
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

**Prenumerata w redakcji**
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

**Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

**Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

**Nakład**: 1 000 egz.

Фота і тэкст Ганны Кандрацюк

# Простыя дадаткі да агіяграфіі бласлаўлёнага Папялушкі

**На сустрэчу з Марыяннай Папялушка дамовіліся мы ў Божае Цела, пасля абеду. Паўтара тыдня ад першай паездкі ў Акопы. Бо тады, як скажа Станіслаў, брат бласлаўлёнага, не будзе працы ў полі і будзе можна ладзіць бяседы. Па сённяшні дзень я пад уражаннем тае сустрэчы, паколькі адбылася яна ў гарачы час падрыхтовак, тры дні да беатыфікацыі Ежы Папялушкі. У Сухаволю прыехалі мы далёка да назначанага часу, быццам да канца не верылі ў тое, што здарыцца. Магчыма, так спрацоўваў медыйны шум вакол беатыфікацыі. Цягам апошняга тыдня на ўсіх тэлеканалах і радыёстанцыях, у прэсе ды інтэрнэце навысвятлялі жыццёвы шлях пакутніка, даказвалі пра цудоўнасць перамогі добрага над злым. У такіх узнёслых хвілінах чалавек адчувае сябе не надта годным, каб дакранацца хоць бы думкамі да нябесных ідэалаў. Ды разумелі яшчэ, што ў падобных справах амбіцыі не маюць значэння...**

„Страшны Двор"

Таму, каб неяк збіць час і не з'явіцца да назначанай гадзіны, мы паехалі спачатку ў Дамураты над Бобрай, вёску, так сказаць, на канцы краіны ксяндза Ежы Папялушкі, значыць, на акраінах Сухавольскай гміны. У міжваенны час дзейнічаў там філіял віленскага гуртка Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. У стадолах ставілі беларускія спектаклі, чыталі лекцыі, намаўлялі сялян прымяняць навінкі ў гаспадарцы. Сёння мясціна славіцца вырошчваннем махоркі і гадоўляй малочных кароў. Нягледзячы на свята, на вуліцы было пуста і сонна, хоць сама вёска не напамінала дагараючых мясцінак. Наадварот, у Дамуратах адчувалася перспектыўнасць. Так ці інакш нам пашанцавала пагутарыць з маладым гаспадаром, які разам з жонкай і дзіцяткам ды маці-сеніёркай адпачывалі перад белай мураванкай, прыздобленай кошыкамі з фіялетавымі геранямі.

— А ці хто з вашай вёскі збіраецца на беатыфікацыю ў Варшаву? — пацікавіліся мы.

— А мы ж з іншай парафіі! — пачулася ў адказ.

Ужо раней нас здзіўляла адсутнасць афішаў ды якой-колечы рэкламы ў гміне пра векапомную падзею. Гэты недахоп нам ахвотна пракаментавалі ў Дамуратах:

— Як ужо яго зробяць святым, то тады і мы павесім яго абразы.

У апошнім сцвярджэнні мы пачулі нешта накшталт недаверу і асцярожнасці...

Праўда, больш чым сялянская асцярожнасць уразіла нас свядомасць. На пытанне ці размаўляюць у Дамуратах яшчэ па-просту, мы пачулі:

— Гэта не зусім па-просту, а быццам па-беларуску! — паясніў нам малады гаспадар. У слове „беларускі" прагучала шмат сімпатыі. Нам чамусьці падумалася, што гаспадар прывёз з Беларусі жонку...

* * *

Тое, што адразу ашаломіць наведвальніка ў краіне ксяндза Ежы Папялушкі, гэта процьма дарог-брукаванак, якія спалучаюць багатыя і перспектыўныя вёскі. У такім суседстве яны выглядаюць як экалагічныя сцежкі, або турыстычныя шляхі, падрыхтаваныя для фатаграфавання або здымання на камеру. Падобнай брукаванкай дабіраліся мы з Дамурат у Гродзіск, вёску прыздобленую страшылкамі і легендамі ды старым гарадзішчам як у Гацьках каля Бельска. Паездка ў гэтую вёску мела для нас дадатковае значэнне, тут менавіта сто гадоў таму нарадзілася маці бласлаўлёнага Марыянна Папялушка. Ля могілак мы сустрэлі маладзёна, у якога пачалі пытаць пра гарадзішча, якое добра відаць з кладзьбішча:

— A wam chodzi o to miejsce gdzie straszy?

— А гэта не тут? — здзівіліся мы.

— Nie, jak się jedzie w kierunku Laudańszczyzny, to jest taki zrujnowany dwór. I tam ponoć zjawia sie rycerz bez głowy i prowadzi konia...

Ад падобнай сенсацыі аж закружылася ў галаве і хацелася распытаць пра каня, без якога не абыдзецца ні адна легенда пра яцьвягаў. Тут непадалёк і вёска Кярсноўшчына (літоўцы называлі яцьвягаў кярснова). З апошнім словам я знаёмая з дзяцінства, паколькі ў маіх прынарваўскіх мясцінах выступала прозвіша Кярсноўскія...

Праўда, у справе легенд-страшылак мы хутка згубілі паслядоўнасць. Калі ў зваротнай дарозе мы яшчэ распытаем пра той двор і страшылкі ў маладых дзевак, якія бавілі час на аўтобусным прыпынку, хоць нідзе не збіраліся ў дарогу, мы пачулі штосьці знаёмае з рамантычнай літаратуры:

— Tu nocą zjawia sią człowiek skuty łańcuchami, i psy on za sobą prowadzi. Widziało to ponoć kilka osób...

* * *

У сялян, якія адпачывалі на лавачцы ля хаты з залочанымі аканіцамі, мы спыталі пра іх адносіны да новага бласлаўлёнага і ці не збіраюцца яны з пілігрымкай на ўрачыстасць у Варшаву. Апошняе пытанне ўнушаў адзін сюжэт з тэлебачання, які інфармаваў, што ўся Польшча, ад мора па горы, збіраецца ў сталіцу:

— Можа наш ксёндз паедзе? — задумаліся ўголас жанчыны. Яны самі, як і дзядзькі, якія выседжвалі на асобнай лавачцы, не збіраліся ў дарогу. Ды і тая Варшава з перспектывы Гродзіска здавалася чуць не ў Амерыцы.

— Pani, tam jedne powodzie. Nie wiadomo, co do niedzieli jeszcze będzie...

Гродзіск захаваў яшчэ той этнічны каларыт, калі на лавачцы людзі любяць пажартаваць, або даказаць ці падвесці такіх цікаўных як мы пад дурнога хату. Калі мы спыталі пра самую блізкую дарогу ў Акопы, дзядзькі паказалі нам на загароддзе:

— На ўпрашчке!

Дом, у якім нарадзілася маці бласлаўлёнага

*(працяг будзе)*

# 18.07 — 24.07

**(22.03. — 20.04.)** Перад табою час рамантычных сустрэч і здзяйснення нават экстравагантных мараў. Нішто не змуціць тваёй радасці жыцця. Лёгка расправішся са старымі праблемамі, а нават змабілізуюць цябе яны да яшчэ больш рашучых крокаў.

**(21.04. — 21.05.)** Перад табою многа працы і абавязкаў; усё, за што возьмешся, зробіш дакладна і прынясе гэта табе шмат задавальнення, таксама і фінансавага. Поспехі ў кожнай галіне, дзякуючы паслядоўнасці і працавітасці.

**(22.05. — 22.06.)** Не шкадуй каханай асобе мілых слоў — могуць задзейнічаць цудоўна! Не страчвай запалу. Будзеш поўны лёгкасці і жыццярадаснасці. Сябры — невычэрпная крыніца радасці. Калі моцна прысвячаеш сябе чамусьці нявартаму таго, патрактуй гэта як урок і доказ таго, што кожны можа памыліцца.

**(23.06. — 23.07.)** Могуць у табе нараджацца розныя боязі, ды трактуй гэта як падказку, што яшчэ трэба паправіць. Крыху малавата энергіі, пачуццё, што ўсё цябе перарастае. Засяродзься на адным, найважнейшым, і абмяжуй дзеянні, якія патрабуюць дастасоўвання сябе, крэатыўнасці і гнуткасці.

**(24.07. — 23.08.)** У каханні чым менш чакаеш, тым больш здарыцца! Твая паслядоўнасць будзе ўзнагароджана. Дома, калі бярэшся за рамонт, лепш перадай гэтую справу спецыялістам. Рамонт цела таксама магчымы — найлепш выберыся на купанні.

**(24.08. — 23.09.)** Усё ўдаецца, ды не заўсёды знаходзіш у сабе адпаведную матывіроўку. Атмасферу саперніцтва можаш перанесці кепска. Могуць здарацца незвычайныя сітуацыі. На працы будзеш хуткі, рашучы і ўпэўнены ў тым, чаго хочаш. Настрой вельмі добра можа паправіць змена атачэння.

**(24.09. — 23.10.)** Крыху менш энергіі, цяжка будзе засяродзіцца. Не бяры на сябе зашмат задач. Абавязкова задбай аб адпачынак. Прыватныя справы абмяркоўвай толькі з найбліжэйшымі.

**(24.10. — 22.11.)** З 23.07. (да 27.07.) могуць паўскладняцца твае дзеянні. Трымайся таго, што сабе абдумаў, не збочвай з курсу, а калі не дасі рады, зрабі сабе перапынак, нават даўжэйшы. Павер, што заслугоўваеш права на каханне. Для блізкіх будзь апорай, а не... спонсарам.

**(23.11. — 22.12.)** Крыху клопатаў з 23.07. (да 27.07.), можаш нарабіць непатрэбнага. Перш за ўсё не раскрывай сваіх сакрэтаў перад асобамі, якія ўжо цябе раз падвялі. І не стаў спраў рубам, не ўваходзь у спрэчкі, старайся лагодзіць канфлікты, тым больш што не заўсёды маеш рацыю.

**(23.12. — 20.01.)** 21-25.07. можаш атрымаць цікавую прапанову, над якой варта задумацца. Не будзь лішне сціплым і адрэкамендуй сябе як найлепш! Каханне часам пачынаецца з другога пагляду. Дома не чакай просьбаў, сам запрапануй дапамогу.

**(21.01. — 19.02.)** Нечаканыя змены планаў могуць пайсці ў карысць. На некаторыя прыёмы рашыцца, калі лёс паставіць цябе пад сцяной. Каханню памажы цярплівасцю. 21-25.07. будзеш адораны інтуіцыяй і чуццём у інтарэсах.

**(20.02. — 21.03.)** Засяродзься на бягучых справах, пільнуй абавязкаў і тэрмінаў ды абяцанняў. Хтосьці нядаўна знаёмы, якому будзеш давяраць, моцна падтрымае цябе ў важнай справе. З 23.07. можаш пачаць адчуваць стому; падумай аб масажы або пахатэрапіі. Сябра са знака Скарпіёна зробіць штосьці такое, чаго ты ад яго не спадзяваўся (мілае!).

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

ISSN 0546-1960